Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК І МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

(6626) | 27 лютага 1940 г., аўторак | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб узнагароджанні ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэміка Фаворскага А. Е.

Аперзводка штаба Ленінградскай ваеннай акругі.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ. Справаздачна-выбарныя сходы партыйных арганізацый. Г. Блюмкіна — Штодзённа кіраваць работай партыйных груп. З. Ларысаў — Пад сцягам большэвіцкай крытыкі. Справаздачна-выбарныя сходы прайшлі арганізавана (гутарка з сакратаром Мінскага гаркома КП(б)Б тав. Смоляраў). Папярэднія вынікі (гутарка з сакратаром Сталінскага горкома КП(б)Б тав. Бударыным).

На партыйных канферэнцыях.

КАНДЫДАТЫ ВЫЗВАЛЕНАГА НАРОДА І. Паўлаў— СЯРГЕЙ ПРЫТЫЦКІ.

Фелікс Кон — Памяці П. К. Крупскай.

Выбарчая кампанія ў заходніх абласцях БССР. Тав. К. В. Кісялёў зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

І. Турэцкі — Калі будзе закончана будаўніцтва Мінскага вакзала?

ЗА РУБЯЖОМ:

Прамова Гітлера.

Італа-германскае гандлёвае пагадненне.

Вайна ў Заходняй Еўропе.

Хто дапамагае Манергейму.

Рух супроць аказання дапамогі бела-Фінляндыі.

Тэрор у Францыі.

У пагоні за міністэрскімі партфелямі.

ДА РАЁННЫХ ПАРТЫЙНЫХ КАНФЕРЭНЦЫЙ

...Заслаўскім, Копыльскім, Шклоўскім, ...аўскім, Тураўскім, Сенненскім, Мін... раёнах пачаліся раённыя партыйныя ...ранцыі. Сёння пачнуць сваю рабо... партыйныя канферэнцыі ў Пухавіч... Клімавіцкім, Крычаўскім, Уваравіч... Дыясенскім, Веткаўскім раёнах, а ў ...ныя дні канферэнцыі адбудуцца ва ...раёнах рэспублікі.

...лютага пачнуць сваю работу га... раённыя канферэнцыі Варашылаў... Кагановіцкага і Сталінскага раёнаў ...р. Мінска. У першых числах сака... будуць праведзены гарадскія ...йныя канферэнцыі, а 10—12 сака... адбудуцца абласныя партыйныя кан...цыі.

Справаздачна-выбарныя сходы ў пяр... партыйных арганізацыях падры... к канцу. Яны праходзяць на вы... ідэйна-палітычным узроўні, пад ...м шырокага разгортвання крытыкі і ...мытыкі. У пераважнай большасці ...ных партыйных арганізацый прай... сходы паказалі песную згурта... ...ць, арганізаванасць і непахіснае ...ва большэвіцкіх радоў. На сходах ...сты праяўляюць высокую актыў... смела ўскрываюць недахопы ў ...йнай рабоце, уносяць многа дзейс... прапаноў. Сходы пярвічных партый... арганізацый паказалі бязмежную ах... членаў і кандыдатаў партыі Ста... му Цэнтральнаму Камітэту ВКП(б). ...ш двух год прайшло з часу мінуг... выбараў, а як многа зроблена за ...перыяд! Вялікіх поспехаў дабіліся ...а ўнутраным і знешне-палітычным ...ы радзімы. Усе гэтыя поспехі да... ...ны дзякуючы мудрай палітыцы пар... ...ліна—Сталіна, дзякуючы карэннапе... ...ляшэнню ўсёй арганізацыйна-пар... ...й і масава-палітычнай работы па ...ы гістарычных рашэнняў XVIII пар... ...та з'езда і Майскага пленума ЦК ...). У большасці пярвічных партарганізацый справаздачна-выбарныя сходы ...лі работу кіруючых органаў ада... ...ючай.

...ак многія кіруючыя органы пярвіч... партыйных арганізацый не справілі... пастаўленымі перад імі задачамі. Аб ...сведчыць і той факт, што значная ...асць пярвічных партарганізацый ...ала работу сваіх партбюро, сакра... партарганізацый нездавальняючай ...аздачна-выбарныя сходы многа ўва... ...ялялі пытанням кіраўніцтва пярвіч... партыйнымі арганізацыямі з боку ...маў партыі. Комуністы крытыкавалі ...мы партыі за тое, што яны не... ...ткова кіруюць пярвічнымі арганіза... ...і, мала вывучаюць іх жыццё.

...йныя партыйныя канферэнцыі ўсе... ...а абмяркуюць дзейнасць раённых ...таў партыі і праверяць, як райко... ...жыццяўлялі рашэнні XVIII з'езда і ...та пленума ЦК ВКП(б), як райко... ...партыі дапамагалі комуністам раёна і ...й партарганізацыі паасобку расціць ...ў і працаваць.

...гасныя партыйныя арганізацыі ...кіраўніцтвам раённых камітэтаў пар... за апошнія гады выхавалі сотні і ...ты перадавых людзей сяла. Многія з ...яўляюцца орэнаноснымі і вядомы ...межамі нашай рэспублікі. За гэтыя ...оды вырашчана вялікая армія трак... ...таў, камбайнераў і іншых механізатараў сельскай гаспадаркі. Многія калгасоўгасы нашай рэспублікі былі ...таўлены на Усесаюзнай сельскагас... ...чай выстаўцы, на гэтым усенарод... ...аглядзе перамог сацыялістычнага ...робства. Калгасы рэспублікі дабіліся ...ых поспехаў у павышэнні ўраджай... і развіцці жывёлагадоўлі. Аднак і ...тых пытаннях прадстаіць яшчэ мно... ...рабіць.

...а калгасных партыйных арганізацый ...ь вялікі вопыт работы па меліяра... ...па асушцы балот. Задача раённых ...ерэнцый заключаецца ў тым, каб ...ацяць гэты вопыт і зрабіць яго зна... ...ам сотняў партыйных арганізацый.

...прайшоўшых справаздачна-выбарных сходах пярвічных партарганізацый крытыкавалі райкомы партыі за тое, што яны мала чаго зрабілі для развіцця мясцовай прамысловасці. Асабліва гэта датычыць Барысаўскага, Плешчаніцкага, Шклоўскага, Рэчыцкага раёнаў. У гэтых раёнах, як і ў радзе іншых раёнаў рэспублікі, не было праяўлена дастатковай ініцыятывы ў справе выкарыстання мясцовых рэсурсаў.

«Веданьне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, пранікненне ў эканоміку, выяўленне скрытых у нетрах багаццяў, шырокае скарыстанне карысных выкапняў, рэк, азёр, — такія задачы раённых кіраўнікоў. Не плаваць па паверхні, а па-гаспадарску ведаць і па-большэвіцку распараджацца ўсім, што ёсць у раёне, — вось чаго патрабуе партыя ад партыйных кіраўнікоў любога раёна, абласці, края.

Канкрэтна кіраваць усім палітычным гаспадарчым, культурным жыццём раёна — гэта зусім не значыць падмяняць і падмінаць усе раённыя арганізацыі, наадварот—майстэрства раённага партыйнага кіраўніцтва заключаецца ў тым, каб усямерна заахвочваць, падтрымліваць і развіваць актыўнасць і самадзейнасць любой раённай ячэйкі — дзяржаўнай, грамадскай». (Перадавы артыкул «Правды» за 26 лютага).

У нашай рэспубліцы ёсць многа скрытых у нетрах багаццяў. Мы маем многа рэк, азёр, карысных выкапняў, лясоў, торфу і іншых багаццяў. Для развіцця мясцовай прамысловасці ёсць самыя спрыяючыя ўмовы. Трэба толькі, каб райкомы партыі сур'ёзна ўзяліся за гэтую справу.

За справаздачны перыяд партыйныя арганізацыі з поспехам пралаўжалі ачышчаць свае рады ад трацкісцка-бухарынскага атрэ'я. За гэты час у партыю ўступілі тысячы перадавых рабочых калгаснікаў, інтэлігентаў, яшчэ больш умацавалася сувязь партыйных арганізацый з працоўнымі. Аднак і ў гэтым пытанні ў многіх партарганізацыях ёсць нямала прабелаў. Рад раённых партыйных арганізацый рэспублікі вельмі заняпяваюць прыём у партыю перадавых людзей, дрэнна вырашчваюць актыў — гэтую сілу, якая дапамагае партыі ажыццяўляць не кіраўніцтвы.

Як райком партыі ажыццяўляў рашэнні вышэйстаячых партыйных арганізацый па пытаннях росту партыі, выхавання і вырашчвання маладых кадраў, як дапамагаў комуністам у аўладанні большэвізмам, — усё гэта павінна з'явіцца прадметам абмеркавання на раённай партыйнай канферэнцыі.

Вялікім недахопам работы многіх райкомаў партыі з'яўляецца тое, што яны да гэтага часу яшчэ не навучыліся пасапраўднаму кіраваць друкам і скарыстоўваць яго, як самую моцную і вострую зброю партыі. Работа з пісьмамі друкам, з рабселькорамі ў радзе раёнаў нашай рэспублікі закінута. Гэтае пытанне неабходна абмеркаваць на раённай партканферэнцыі.

Раённыя партыйныя канферэнцыі павінны прайсці пад знакам разгортвання большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі прайсці на высокім ідэйна-палітычным узроўні.

Пры падборы кадраў у кіруючыя парторганы трэба кіравацца сталінскім указаннем — падбіраць работнікаў, якія заслугоўваюць палітычнага давер'я і маюць неабходныя дзелавыя якасці большэвікоў, да канца адданых партыі Леніна—Сталіна, здольных узначаліць актыўнасць партыйных і непартыйных мас.

Раённыя партыйныя канферэнцыі яшчэ больш згуртуюць партыйныя масы вакол Цэнтральнага Камітэта партыі і вакол любімага правадыра працоўных таварыша Сталіна, намецяць мерапрыемствы для паспяховага выканання рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б) і Майскага пленума ЦК партыі, выберуць у кіруючыя органы большэвікоў, здольных мабілізаваць усіх працоўных на барацьбу за новыя перамогі комунізма.

НА ПАРТЫЙНЫХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ

Мінскі раён

Учора ў Мінскім Доме партыйнага актыва адкрылася трэцяя раённая партканферэнцыя Мінскага сельскага раёна. На канферэнцыі прысутнічае 115 дэлегатаў з рашаючым і 21 з дарадчым голасам.

Пад неўмаўкаючыя авацыі і прывітальныя воклічы пачотным старшынёй канферэнцыі выбіраецца вялікі Сталін. З вялікім энтузіязмам канферэнцыя выбірае пачотны прэзідыум у саставе членаў Палітбюро ЦК ВКП(б), таварышоў Хозе Дыаса і Дзімітрава.

У сваім справаздачным дакладзе сакратар райкома тав. Прасмыцкі расказаў, як партыйная арганізацыя змагалася за рэалізацыю рашэнняў XVIII з'езда партыі і Майскага пленума ЦК ВКП(б) і якія задачы стаяць перад комуністамі раёна на бліжэйшы перыяд.

— Да XVIII з'езда ВКП(б),—гаворыць т. Прасмыцкі,—у раёне не было ні адной калгаснай партарганізацыі. Зараз ёсць тры калгасныя арганізацыі, дзве кандыдацкія групы і тры партыйна-комсамольскія групы.

Партыйная арганізацыя значна вырасла. Яна налічвае зараз 345 членаў і 221 кандыдата КП(б)Б. За справаздачны перыяд прынята ў члены партыі 107 чалавек і ў кандыдаты—245. У ліку прынятых у партыю — дэпутат райсавета арэнаносец тав. Бегун, старшыня калгаса імені Сталіна т. Савіч, калгаснік па Рудзінская і інш.

Аднак вялікім недахопам з'яўляецца слабы рост партыйных радоў за лік лепшых калгаснікаў і рабочых МТС і саўгасаў, якіх за справаздачны перыяд прынят у партыю толькі 41 чалавек. Партарганізацыя саўгаса «Комінтэрн» не прыняла ў кандыдаты КП(б)Б ні адна трактарыста. Слаба расла партыйная арганізацыя за лік жанчын.

Комуністы раёна па-большэвіцку змагаліся за арганізацыйнае ўмацаванне калгасаў, павышэнне ўраджайнасці. Комуністы Трушкевіч, Бейнэ, Бегун, Савіч і іншыя з'яўляюцца перадавікамі сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, кандыдатамі на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку ў 1940 годзе.

Ужо зараз залічана кандыдатамі на сельскагаспадарчую выстаўку у 1940 г. 12 калгасаў і 275 перадавікоў сельскай гаспадаркі.

Затым дакладчык заваструў увагу канферэнцыі на радзе буйных недахопаў у рабоце калгасаў. У раёне яшчэ ёсць калгасы, якія не закончылі абмалоту, не выканалі дзяржаўных хлебапаставак. Не пакінуто засыпан яшчэ насенны фонд. У асобных калгасах слаба ідзе рамонт інвентара і сартыроўка насення.

1.100 партыйных і непартыйных большэвікоў раёна самастойна вывучаюць гісторыю ВКП(б), з іх 255 комуністаў і 485 комсамольцаў. У дапамогу гэтым таварышам прачытаны 34 лекцыі па гісторыі ВКП(б), праведзена 5 тэарэтычных субяседаванняў, арганізаван лекторый у Астрашыцкім гарадку на 65 чалавек.

Выступаўшыя ў спрэчках таварышы Трушкевіч (калгас «Чырвоны агароднік»), Фрыдман (Прыгарадны сельсавет) адзначылі, што райком не аказваў неабходнай дапамогі комуністам, самастойна вывучаючым гісторыю партыі. Мала лекцый было прачытана ў сельсоветах; гуды радка выязджалі кваліфікаваныя кансультанты. Не быў папулярызаван вопыт комуністаў, закончыўшых вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Тав. Давідовіч (калгас імені Кастрычніцкай рэволюцыі) сказаў на канферэнцыі, што за апошні час агітацыйна-масавая работа ў раёне значна аслабла. Многія агітатары, паказаўшыя ўзоры работы ў перыяд выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных, зараз зусім не праводзяць гутарак на былых выбарчых участках.

Тав. Буткевіч звярнуў увагу канферэнцыі на слабую пастаноўку абароннай работы ў раёне. Ён указаў на факты антызяржаўных адносін да конскага паголоўя. У асобных сельсоветах,—гаворыць тав. Буткевіч,—ёсць да 40 проц. знясіленых коней. Многія арганізацыі Асоавіяхіма спынілі сваю работу.

Тав. Герман крытыкаваў райком за слабае кіраўніцтва пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі. У Пагайскай партарганізацыі 6 месяцаў не было парторга, і ў рэзультаце партыйная работа значна аслабла. Райкому гэты факт быў вядомы, але меры не былі прыняты.

Усяго ў спрэчках па справаздачнаму дакладу выступіла 19 чалавек. Аднак многія таварышы абмежаваліся гаспадарчымі пытаннямі, мала ўдзялялі ўвагі ўнутрыпартыйнай рабоце. Недастаткова ўскрывалася недахопы ў рабоце райкома партыі.

Сёння канферэнцыя прадаўжае сваю работу.

БЕШАНКОВІЧЫ

Два дні пралаўжаўся справаздачна-выбарны сход Бешанковіцкай партарганізацыі. Сакратар райкома тав. Гаўрушаў расказаў, як за справаздачны перыяд вырасла і ўмацавала свае рады раённая партыйная арганізацыя. Прынята ў кандыдаты партыі 162 чалавекі і ў члены—54. Павялічылася і колькасць пярвічных партарганізацый. Многія комуністы вылучаны на кіруючую партыйную, совецкую і гаспадаючую работу.

Вялікая работа праведзена райкомам партыі ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Комуністы, комсамольцы і беспартыйная пралоўная інтэлігенцыя з вялікай цікавасцю вывучаюць гісторыю партыі. Больш тысячы экземпляраў кнігі «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» разышлося сярод працоўных Бешанковіцкага раёна.

Партарганізацыя раёна правяла вялікую падрыхтоўку да выбараў у Вярхоўны Совет БССР і мясцовыя Саветы, што забяспечыла бліскучыя вынікі выбарчай кампаніі.

За справаздачны перыяд комсамольская арганізацыя раёна папоўніла свае рады і зараз налічвае да 2500 чалавек. У раёне налічваецца 184 комсамольскія арганізацыі, з іх калгасных 136. У партыю прынята 95 комсамольцаў. Як ніколі, павялічылася роля ленінска-сталінскага комсамола ў дзяржаўным і гаспадарчым жыцці.

Дакладчык гаварыў дзве гадзіны. Аднак ён не ўскрыў буйнейшых недахопаў у рабоце раённай партарганізацыі. Не паказаў тав. Гаўрушаў авангардзнай ролі комуністаў і партарганізацыі ў рэалізацыі рашэнняў Майскага пленума ЦК ВКП(б). У дакладзе не былі вызначаны задачы партарганізацыі ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Між тым, райком партыі не забяспечыў поўнага выканання пастановы СНК і ЦК ВКП(б) аб абмеры прысядзібных участкаў. У выніку абрэзка сядзіб па раёну яшчэ не закончана.

Нічога не было сказана ў дакладзе аб барацьбе з парушэннямі Статута сельгасарцелі, хоць у раёне меліся такія факты.

Па справаздачнаму дакладу з запісаўшыхся 30 чалавек выступіла 25. Яны значна дапоўнілі даклад сакратара райкома.

На недахопы кіраўніцтва МТС з боку райкома партыі ўказаў у сваім выступленні тав. Фралоў. Дырэктароў МТС, — гаворыць ён, — выклікалі на пасяджэнні райкома толькі ў час кампаніі для таго, каб паругаць за правал работы. Недастаткова дапамагаў райком работнікам МТС у арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва.

Сакратар партарганізацыі райвыканкома тав. Прохараў падкрэсліў, што райком не аказваў належнай дапамогі сакратарам пярвічных партарганізацый. За год праведзена ўсяго пекалькі нарад. Інструктары райкома вельмі мала бываюць у пярвічных партарганізацыях.

Дапамога самастойна вывучаючым «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» арганізавана слаба, — сказаў т. Дзянел. — Некаторыя комуністы зусім не займаюцца павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню.

У партарганізацыі мелі месца парушэнні прынцыпа індывідуальнага адбору ў партыю. Былі прыняты ў кандыдаты партыі неправерэныя людзі, якіх прышлося затым выключыць.

Комуністы ўпеслі рад практычных прапаноў па далейшаму паляпшэнню работы партарганізацыі.

У саставе райкома выбрана 17 членаў і 3 кандыдаты. Рэвізійная камісія выбрана ў саставе пяці чалавек.

На адбыўшымся пленуме райкома першым сакратаром выбран тав. Гаўрушаў, другім — тав. Бароўскі, трэцім — тав. Навалворскі.

Пленум выбраў бюро райкома ў колькасці 7 чалавек.

І. АЛЯКСАНДРАЎ.

Кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Сямён Ільч Царэнка — старшыня Баранавіцкага абласнога выканаўчага камітэта. Фото Б. Вернера. (Фотахроніка БЕЛТА).

НОВЫ ПАРАДАК ПРАДСТАЎЛЕННЯ ДА ВУЧОНЫХ ЗВАННЯЎ

Камітэт па справах вышэйшай школы пры СНК СССР устанавіў новы парадак прадстаўлення да вучоных званняў навукова-педагагічных работнікаў інстытутаў.

Советы вышэйшых навучальных устаноў могуць прадстаўляць да прысуджэння звання прафесара асоб, маючых вучоную ступень доктара навук і зацверджаных у якасці загадчыкаў кафедрай або выбраных па конкурсу на пасаду прафесара кафедры. Да звання дацэнта прадстаўляюцца асобы, маючыя вучоную ступень кандыдата навук і займаючыя штатную пасаду дацэнта або выбраныя на гэтую пасаду па конкурсу.

Высокакваліфікаваныя спецыялісты з вялікім вытворчым стажам, прыцягнутыя да выкладчыцкай работы ў вышэйшых навучальных установах, могуць быць прадстаўлены да зацвярджэння ў вучоных званнях прафесара або дацэнта пасля выбрання па конкурсу па гэтую пасаду і па сканчэнні поўгадовай пасяховай педагагічнай дзейнасці ў данай ВНУ.

Да звання прафесара і старшага навуковага супрацоўніка навукова-даследчых інстытутаў прадстаўляюцца асобы, маючыя вучоныя ступені доктара і кандыдата навук і займаючыя ў інстытутах адпаведныя пасады.

Прысуджэнне вучоных ступеняў і званняў, выбранне па конкурсу на пасады праводзіцца ў Советах ВНУ і навукова-даследчых інстытутах тайным галасаваннем. Галасаванне лічыцца сапраўным, калі ў ім прымала ўдзел не менш двух трэцей зацверджаных членаў Совета.

(ТАСС).

10-ГОДДЗЕ АКАДЭМІІ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТА імені СТАЛІНА

МАСКВА. Акадэмія чыгуначнага транспарта імені Сталіна 1 сакавіка адзначае дзесяцігоддзе свайго існавання. Пры штодзённай дапамозе Наркома шляхоў зносін тав. Л. М. Кагановіча яна перетварылася ў аспоўную кузню падрыхтоўкі кіруючых кадраў для чыгунак Совецкага Саюза. За 10 год выпушчаны сотні спецыялістаў, многія з якіх працуюць начальнікамі буйнейшых дарог.

На шасці аспоўных факультэтах акадэміі зараз навучаецца 619 студэнтаў. Сярод іх — 114 орэнаносцаў, 22 дэпутаты Вярхоўных Советаў распублікі і Саюза ССР. Апрача таго, без адрыву ад вытворчасці ў акадэміі вучацца 290 маскоўскіх чыгуначнікаў.

Калектыў акадэміі прыходзіць да юбілея з вялікімі поспехамі. У спаборніцтве з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Бауманскага раёна ён атрымаў у студзені герахоўзячы чырвоны сцяг. Пяршынства акадэмія трымае і ў спаборніцтве з вышэйшымі тэхнічнымі навучальнымі ўстановамі чыгуначнага транспарта.

Калектыў акадэміі высунуў дзесяткі выдатных вучоных і вынаходнікаў. Дацэнт тав. Рэшэтоў сканструіраваў канцэлёр для аўтаматычнага ўпраўлення пускам маторных вагонаў, якім зараз абсталявана большасць электрапаязноў. Студэнт тав. Халяпін распрацаваў метад скаразнога рамонту таварных паязноў, прымяняемы ўжо ў многіх чыгуначных майстэрнях. Выкладчыкі тт. Судакоў і Афанасьеў сканструіравалі ўстаноўку для ўлаўлівання ў дымавой каробцы часцінак нераспаленага вугалю, што зэканоміць сотні тон паліва.

Да юбілея акадэміі выпускаецца вялікі зборнік навукова-даследчых работ.

(ТАСС).

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
аб узнагароджанні ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэміка ФАВОРСКАГА А. Е.

У сувязі са спаўняючымся 80-годдзем з дня нараджэння і 55-годдзем навукова-педагагічнай дзейнасці буйнейшага вучонага хіміка-арганіка ўзнагародзіць ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэміка Фаворскага Алексея Еўграфавіча.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль,
25 лютага 1940 г.

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

Па прапягу 26 лютага на Карэльскім перашэйку нашы часці прадаўжаюць ...чанне ўмацаванняў праціўніка. Спробы праціўніка контратакаваць нашы ...ні адбіты з вялікімі для яго стратамі. У адной з контратак падбіта 5 танкаў ...ціўніка, з якіх 3 захвачаны нашымі часцямі.

Па далатковых даных на востраве Кайвісто (Б'ёрке), звыш указаных ваен... трафеяў у зводцы ад 24 лютага, нашымі часцямі захвачана 26 абарончых ...наваных пунктаў праціўніка, з іх 15 жалезабетонных аргылерыйскіх збудаванняў, апрача таго 2 крапасныя казематы, 4 склады са зброяй і харчаваннем, ...тысяч спарадаў, звыш 5 мільёнаў патронаў.

Па астатніх участках фронта не адбылося нічога істотнага.

Наша авіяцыя вяла актыўныя баявыя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка. У адбыўшыхся баях збіта 19 самалётаў праціўніка.

Да ведама дэлегатаў райпартканферэнцый

У раённая партыйная канферэнцыя Сталінскага раёна г. Мінска адкрываецца 29 лютага, у 7 г. вечара, у памяшканні клуба завода імені Варашылава (вул. Кірава).

Выдача пасведчанняў дэлегатам праводзіцца з 28 лютага ў памяшканні РК КП(б)Б (Чырвонаармейская 26, III паверх, пакоі №№ 27 і 28) з 11 г. раніцы да 4 г. дня і з 7 да 11 г. вечара (Тэлефоны №№ 25-045, 24-854).

У райпартканферэнцыя Кагановіцкага горкома КП(б)Б склікаецца 29 лютага у 7 г. вечара ў памяшканні клуба імені Сталіна (рог вуліц Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай).

Дэлегаты, выбраныя на райпартканферэнцыю, павінны з'явіцца ў Кагановіцкі РК КП(б)Б (у пакой № 11) 27 і 28 лютага 1940 г. для рэгістрацыі і атрымання часовых пасведчанняў.

У партыйная канферэнцыя Варашыкаўскага раёна г. Мінска склікаецца 29 лютага ў клубе НКВД. Пачатак канферэнцыі ў 6 г. вечара.

Рэгістрацыя дэлегатаў у клубе НКВД з 4 г. дня.

Пасведчанні выдаюцца ў РК КП(б)Б з 27 лютага з 10 да 12 г. дня і з 7 да 9 г. веч.

Узнагароджанне ўдзельнікаў разгрому белых банд і інтэрвентаў у Закаспіі

АШХАБАД, 25 лютага. (ТАСС). У азнаменаванне 20-годдзя ліквідацыі Закаспійскага фронта, Прэзідыум Вярхоўнага Совета Туркменіі ўзнагародзіў пачоснымі граматамі 41 актыўнага ўдзельніка разгрому белагвардзейскіх банд і інтэрвентаў у Закаспіі. У ліку ўзнагароджаных: камбрыг двойчы ордэнаносец тав. Цімошкаў—былы камандуючы Закаспійскім фронтам, палкоўнік тав. Хрулёў — былы камандзір казанскага палка, тав. Курбанаў Алаяр—былы камандзір туркменскага коннага атрада, тав. Лабачоў — былы камандзір 1-га туркменскага стралковага палка, баец гэтага-ж палка тав. Гераськін, начальнік палявога штаба фронта тав. Філіпаў і іншыя.

Новыя торфаздабываючыя машыны

Тарфяная прамысловасць у бягучым годзе атрымлівае новыя машыны совецкай канструкцыі.

Вялікую цікавасць прадстаўляе машына для карчоўкі пнёў пры падрыхтоўцы тарфяных палёў. Гэтая машына механізуе работы, якія цяпер праводзяцца ўручную. За гадзіну выкарчоўваецца да 100 пнёў. Машына пры абарудаванні спецыяльнымі прыстасаваннямі можа быць скарыстана для рыцця канаў, пагрузкі торфу, забіўкі свай і т. д.

Упершыню па тарфяных палях з'явіцца дрэнажна-ныскавая машына. Яна прызначаецца для ўстройства закрытых асушальных сетак (дрэны) на палях, дзе разліваецца гідраторф. Зараз для асушання рыюцца ўручную адкрытыя канавы. Гэтая машына, замяняючы ручную працу, дазволіць разам з тым паскорыць працэс натуральнай сушкі торфу. Вопытныя ўзоры ўжо выпрабаваны, рэзультаты цалкам здавальняючыя.

Для тарфянай прамысловасці вырабляецца новы магутны перагрузачны кран. З яго дапамогай можна будзе шырока механізаваць акараваніванне (складванне ў буйныя штабелі) торфу.

У сезон 1940 года на ўборцы кусковага торфу будзе працаваць каля 100 агрэгатаў. Кожны з іх замяняе да 200 рабочых. На ўборку фрэзернага торфу ставіцца звыш 80 машын, з якіх кожная замяняе да 50 чалавек.

(ТАСС).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫЯ СХОДЫ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

* * *

ШТОДЗЁННА КІРАВАЦЬ РАБОТАЙ ПАРТЫЙНЫХ ГРУП

(Мінскі станкабудаўнічы завод імені Кірава)

Сакратар партбюро завода імені Кірава тав. Міндэль асцярожна і ераліставў старонкі справаздачнага дакладу. Ён стараўся нічога не ўпусціць, ні аб чым не забыць. Усе пытанні былі як-быццам асветлены ў справаздачным дакладзе, аб усім сказана. Але ўсё-ж даклад не мог задаволіць комуністаў завода, не было ў ім адказу на пытанні, хвалюючыя партыйную арганізацыю.

На заводзе ёсць 4 цэхавыя партыйныя групы. Арганізаваны яны ў чэрвені 1939 г. Як працавалі партыйныя групы?

У сваім дакладзе тав. Міндэль вымушан быў прызнаць, што цэхавыя партгрупы працавалі слаба, што партбюро мала займалася іх работай.

Дакладчык абмежаваўся гэтымі словамі. А трэба было сказаць значна больш.

Вось, к прыкладу, партыйная група механічнага цэха. За ўвесь час гэта партгрупа збіралася толькі чатыры разы. Комуністы — выдатныя стаханаўцы цэха тт. Лабуць, Сырцоў, Красік—не маюць ніякіх партыйных даручэнняў, не ўцягнуты ў актыўную партыйную работу. Парторг т. Міккін — упершыню на кіруючай работе, ён адчувае патрэбу ў дапамозе, але партыйнае бюро ні разу не ставіла пытання аб партыйнай групе і ніякай дапамогі ёй не аказвала.

Партыйная група інструментальнага цэха працавала нярэгна. Усе комуністы вывучаюць гісторыю ВКП(б), актыўна ўдзельнічаюць у грамадскай работе. На сходзе партгрупы абмяркоўваліся вытворчыя пытанні: аб пякучасці рабочай сілы і інш. Аднак начальнік цэха Лаўрусевіч сваім самадурствам перашкаджае работе групы. Ён груба заціскае самакрытыку. Тых, хто асмельваецца выступіць супроць яго, ён пад рознымі прадлогамі выжывае з цэха. Так, за кароткі перыяд ушлі тры комуністы: стаханаўцы тт. Красік і Казакевіч і загадчык інструментальнай т. Шэўчук. Парторг т. Мурох паставіў на сходзе групы пытанне аб антыпартыйных паводзінах тав. Лаўрусевіча, які дэзарганізуе работу ў цэху. Назаўтра-ж Лаўрусевіч, пад выглядам вылучэння, зняў т. Муроха з работы.

Аб гэтым партыйная група сігналізавала партыйнае бюро, але яно не занялося гэтым пытаннем.

Не дапамог арганізаваць работу партыйных груп і Сталінскі райком КП(б)Б. Ён наогул вельмі мала аддаваў увагі заводу.

Чаму завод імені Кірава на працягу пяці месяцаў не выконваў вытворчай праграмы? Аб гэтым многа гаварылі ў спрэчках. Большасць выступаўшых адзначала, што партыйнае бюро слаба займалася вытворчымі пытаннямі. Аб вытворчасці ўспаміналі толькі тады, калі быў прарыў на тым або іншым участку.

Партыйнае бюро зусім слаба кантраліравала дзейнасць адміністрацыі прадпрыемства. У ліцейным цэху быў вялікі брак ліцця. Начальнік цэха комуніст т. Крывашэін арганізоўваў у цэху п'янкі. Ці ведала партыйнае бюро аб гэтым? Даўно ведала і ніяк не магло заняцца гэтым пытаннем. Прайшло многа часу, пакуль бюро ўспаміла аб ліцейным цэху.

Партыйная арганізацыя завода імені Кірава вырасла за справаздачны перыяд на 36 чалавек. У кандыдаты ВКП(б) прыняты лепшыя людзі завода: стаханавец т. Гарэзіенка, як выконвае план на 220 проц., т. Гімельштэйн, вылучаны зараз майстрам цэха і інш. Многія з іх упорна авалодваюць марксісцка-ленінскай тэорыяй і з'яўляюцца перадавікамі на вытворчасці. Паставіць узорна работу з маладымі комуністамі — пярэдняя абавязак партыйнага бюро. Аднак бюро аддавала недастаткова ўвагу гэтаму важнейшаму пытанню.

Сход прайшоў на высокім ідэйна-палітычным узроўні. Дзейнасць бюро была падвергнута рэзкай крытыцы. Было ўнесена многа каштоўных прапаноў аб паляпшэнні работы партыйнай арганізацыі.

Сакратаром партыйнага бюро выбран тав. Гуліс—рэдактар многатыражкі «Кіравец», намеснікамі сакратара выбраны тт. Мурох і Нахмановіч. **Г. БЛЮМКІНА.**

ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ

(Гутарка з сакратаром Сталінскага горрайкома КП(б)Б тав. Бударытым)

Справаздачна-выбарныя сходы пярвічных партыйных арганізацый Сталінскага горраёна прайшлі пры вялікай актыўнасці членаў і кандыдатаў ВКП(б). На сходах 118 партыйных арганізацый выказалася 1095 комуністаў. У сваіх выступленнях і прапановах комуністы галоўны ўпор рабілі на паляпшэнне работы з маладымі членамі і кандыдатамі партыі і авалоданне марксісцка-ленінскай тэорыяй.

У вытворчых партыйных арганізацыях вялікая ўвага была аддана пытанню кантролю над дзейнасцю адміністрацыі. Нярэдка справілася з гэтай задачай партыйная арганізацыя скурзавода «Большэвік». Тут сапраўды спалучалася палітычная і гаспадарчая работа. Партыйнае бюро канкрэтна кіравала рацыяналізацыяй вытворчасці, рэканструкцыяй цэхаў і многімі іншымі. Большасць комуністаў гэтай партыйнай арганізацыі самастойна вывучае гісторыю ВКП(б). Многія ўжо вывучылі па 4, 5 і 6 раздзелаў «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Моцна крытыкавалі на сходах работнікаў Сталінскага райкома КП(б)Б, якія недастаткова канкрэтна кіравалі і дапамагалі партыйным арганізацыям. Для паляпшэння якасці кіраўніцтва мы зараз рашылі перабудаваць работу нашых інструктароў. Мы думаем арганізаваць яе так, каб кожны інструктар своечасова ўзнімаў патрэбныя пытанні і даводзіў іх да канца.

Работа 103 партыйных арганізацый прызнана здавальняючай, астатнія — незадавальняючай.

58 сакратароў пярэдніх партарганізацый выбраны ў другі раз. Гэтыя людзі, як, напрыклад, сакратар партарганізацыі мясакамбіната т. Шчупак і сакратар партбюро швейнай фабрыкі імені Крупскай т. Зарэцкая, карыстаючыся давер'ем комуністаў, у большасці сваёй таксама маладыя кіраўнікі, але паспеўшыя набыць значны вопыт партыйнай работы.

У выніку справаздачна-выбарных сходаў 60 чалавек прышлі ўпершыню на партыйную кіруючую работу: тав. Айзенберг (старая работніца скурзавода «Большэвік»), тав. Гуліс (рэдактар шматтыражкі завода імені Кірава) і многія іншыя.

Гэтым людзям трэба будзе моцна дапамагчы навучыць іх кіраваць апаратыўна, па-большэвіцку. Мы рашылі ў бліжэйшы час стварыць для іх пяцідзённы семінар, а таксама арганізаваць абмен вопытам шляхам пасылкі таварышоў на тыя прадпрыемствы, дзе лепш арганізавана партыйная работа.

Партыйная арганізацыя Сталінскага горраёна вырасла за справаздачны перыяд на 949 кандыдатаў і 435 членаў ВКП(б). Трэба адзначыць, што асаблівы рост намеціўся пасля XVIII партыйнага з'езда.

Раённы камітэт ставіць сабе ў далейшым задачу — расці за кошт перадавых рабочых вялучых прафесій і лепшых прадстаўнікоў інтэлігенцыі, у асаблівасці за лік жанчын.

На некаторых справаздачна-выбарных сходах былі выпадкі нарушэння статута і інструкцыі ВКП(б). У партыйнай арганізацыі аэраклуба ў шчотную камісію выбралі кандыдата партыі. У гаспарганізацыі штаба МПВА сакратаром быў выбран член партыі з чатырохмесячным партыйным стажам. Бюро райкома адмяніла гэтыя выбары.

* * *

Справаздачна-выбарныя сходы прайшлі арганізавана

(Гутарка з сакратаром Мінскага гаркома КП(б)Б тав. Смолграм)

Справаздачна-выбарныя сходы ў пярвічных партыйных арганізацыях г. Мінска ў асноўным закончаны. На 25 лютага толькі ў 17 пярвічных партарганізацыях з 414 яшчэ не адбыліся сходы.

Правядзенню справаздачна-выбарных сходаў папярэднічала належная арганізацыйная падрыхтоўка. Гэта пытанне было абмеркавана на пасяджэнні бюро гаркома КП(б)Б. У кожным горрайкоме былі праведзены нарады сакратароў пярвічных партыйных арганізацый.

У дапамогу пярвічным партыйным арганізацыям былі прымацаваны члены пленумаў гаркома і горрайкомаў, загадчыкі аддзелаў і інструктары. У рэзультаце справаздачна-выбарныя сходы ў большасці партыйных арганізацый горада прайшлі на высокім ідэйна-палітычным узроўні, арганізавана, пры вялікай актыўнасці комуністаў.

У першыя дні сходаў гарком КП(б)Б заслухаў на пасяджэнні бюро сакратароў горрайкомаў аб ходзе справаздачна-выбарнай кампаніі. Горрайкомамі таксама былі праведзены нарады сакратароў пярвічных партарганізацый, па якіх намечаны далейшыя задачы па ўстараненню выяўленых за першыя дні недахопаў.

У асобных партыйных арганізацыях мелі месца факты нарушэння інструкцыі ЦК ВКП(б) аб выбарах і статута партыі. Напрыклад, у пярвічнай партарганізацыі рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия» сакратаром партыйнай арганізацыі быў выбран таварыш, які не мае гадавога партыйнага стажа. Гэта нарушэнне было своечасова выпраўлена райкомам партыі.

У выніку праведзеных выбараў у пярвічных партарганізацыях да кіраўніцтва прышлі новыя таварышы з ліку радавых комуністаў, апраўдаўшых сябе на практычнай рабоце. Састаў сакратароў пярвічных партарганізацый горада абноўлен больш чым на 50 проц. Сярод выбраных сакратароў 66 жанчын.

Папярэднія вынікі справаздачна-выбарных сходаў у пярвічных партарганізацыях горада паказалі, што ў радзе арганізацый слаба пастаўлена выхаваўчая работа з новапрынятымі ў партыю, недастаткова ўцягненне іх у актыўнае партыйнае жыццё. Асобныя партыйныя арганізацыі яшчэ недастаткова ажыццяўляюць партыйнае кіраўніцтва комсамолам. На сходах комуністы ўзнялі рад важнейшых пытанняў унутрыпартыйнай работы. У якасці першага мерапрыемства па выпраўленню гэтых пытанняў гарком КП(б)Б намячае ў бліжэйшы час правесці ва ўсіх пярвічных партыйных арганізацыях партсходы, на якіх абмеркаваць пытанні аб ўзмацненні кіраўніцтва комсамолам і аб уцягненні ў актыўнае грамадскае і партыйнае жыццё кандыдатаў партыі.

Пад сцягам большэвіцкай крытыкі

(Віцебскі машынабудаўнічы завод «Комінтэрн»)

Калі сакратар партбюро тав. Каган у сваім справаздачным дакладзе адзначыў вялікія вытворчыя поспехі завода, твары прысутных засялі радаснай усмешкай. Машынабудаўнічы завод «Комінтэрн» адзін з першых у БССР датэрмінова закончыў гадавую праграму 1939 года і даў краіне звыш плана прадукцыі на 1.448 тыс. рублёў. План павышэння прадукцыйнасці працы выканан на 140 проц., сабекошт прадукцыі знижан супроць плана на 21,5 проц.

Завод асвоіў новыя віды прадукцыі: свайныя молаты №№ 5 і 7, трактарныя дэталі і разнастайны асартымент прадметаў шырокага спажывання. Калектыў завода ўключыўся ў соцыялістычнае спаборніцтва за выкананне пяцігадовага плана па прадукцыйнасці працы ў чатыры гады.

Гэтыя поспехі выклікаюць заканомную гордасць у большэвікоў завода. Але ажыццяўленне грандыёзных задач трэцяга года трацяй сталінскай пяцігодкі патрабуе яшчэ больш напружанай работы ад кожнага партыйнага і непартыйнага большэвіка. І зразумела, чаму комуністы менш за ўсё спыняліся на поспехах, а галоўным чынам завастралі ўвагу на недахопах у ажыццяўленні партыйнага кантролю над вытворчасцю.

Праўда, партыйнае бюро многа займалася вытворчымі пытаннямі. На пасяджэннях бюро і на партыйных сходах абмяркоўваліся пытанні аб хадзе сацыялістычнага, аб перагляде норм і расцэнак, аб паляпшэнні планіравання ў цэхах і іншыя. Але гэтага далёка недастаткова. Характэрны прыклад прывёў т. Усцін.

— Брак у ліцейным цэху. — заявіў ён. — яшчэ заналта высокі. Партыйнае бюро займалася гэтым, вынесла спецыяльнае рашэнне, але не праверыла яго выканання, а таму і дагэтуль няма паложных разультатаў.

Аб тым, што партыйнае бюро не сачыла за выкананнем сваіх рашэнняў, гаварылі і комуністы тт. Байгакоў, Горскі і іншыя. Яны таксама адзначалі што рад важнейшых вытворчых пытанняў, як падрыхтоўка да зімы, унядрэнне многастаночніцтва і сумяшчэнне прафесій, пякучасць рабочай сілы і іншыя—зусім выпалі з-пад увагі партбюро.

З вялікай актыўнасцю абмяркоўвалі комуністы і іншыя важнейшыя галіны партыйнай работы. Асабліва вострая крытыка далі ўдзельнікі схода дрэнную работу партбюро па арганізацыі прыёму ў партыю. Калектыў завода налічвае 400 рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў, сярод іх ёсць нямала перадавых людзей вытворчасці — стаханаўцаў, ударнікаў, бязмежна адданых справе партыі Леніна—Сталіна, дастойных насіць высокае званне комуніста. Між тым, партыйная арганізацыя за справаздачны перыяд прыняла ў кандыдаты партыі толькі 2 чалавекі і 5 перавяла з кандыдатаў у члены КП(б)Б.

Комуністы правільна ўказвалі на прычыны слабога росту партыйнай арганізацыі. Тт. Яткун і Нарцішка прама заявілі, што партбюро ростам партыі не займалася. Сакратар і члены партбюро не ведалі перадавых людзей завода — стаханаўцаў, ударнікаў, рабочых вядучых прафесій, не вялі работу з беспартыйным актывам.

У выступленнях таварышоў вельмі часта ўпаміналіся прозвішчы кандыдатаў партыі тт. Усмана, Светлгорава і Кузьміна. Доўгія гады яны лічацца кандыдатамі, стаж іх вельмі салідны. Тав. Светлгораў — кандыдат з 1932 года, Кузьмін — з 1933 года. Аб гэтых гаварышах партыйнае бюро зусім забылася. Яно нічога не зрабіла для таго, каб падрыхтаваць іх для ўступлення ў члены партыі.

У цэнтры ўвагі партыйнага схода было тэжэлае пытанне аб партыйнай прапагандзе. Таварышы адзначалі, што адразу пасля выхаду ў свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» партыйнае бюро аказвала вялікую дапамогу самастойна вывучаючым гісторыю партыі. Практыкаваліся таварыскія гутаркі, праводзіліся кансультацыі, чыталіся лекцыі і т. д. Але за апошнія месяцы бюро самаўхілялася ад кіраўніцтва партыйнай прапагандай. Яно не ведае, як комуністы займаюцца палітычнай самаадукацыяй. У сваім дакладзе сакратар партбюро тав. Каган не мог назваць хоць-бы аднаго комуніста, які сур'ёзна працуе над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню. Дрэннае кіраўніцтва партыйнай прапагандай комуністы правільна ацэньвалі, як сур'ёзнейшы прабел у рабоце партыйнага бюро.

З. ЛАРЫСАЎ.

Кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР (злева направа): Міхаіл Алексеевіч — сакратар Пружанскага РК КП(б)Б; Іосіф Юльянавіч Курчэвіч — настаўнік Пружанскай вясковай сярэдняй школы; Яўгенія Сяргееўна Волас — загадчык бібліятэкі Пружанскай вясковай сярэдняй школы; кандыдат у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР Сцяпан Філіпавіч Панярыха — намеснік старшыні Пружанскага раённага выканаўчага камітэта.

Фото В. Лупейка і В. Марціёнка. (Фотахроніка БЕЛТА)

Тав. К. В. КІСЯЛЁЎ ЗАРЭГІСТРАВАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

ГЛЫБОКАЕ. 25 лютага адбылося пасяджэнне Глыбокскай акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР. Старшыня камісіі тав. Кізілейчык паведаміў, што агульнымі сходамі рабочых і служачых соўгаса імені 17 верасня, сходамі сялян вёсак Гваздзёва, Загарамі, Плісы, на якіх прысутнічала 835 чалавек, вылучан кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР старшыня Соўнаркома БССР **Кузьма Вэнедыктавіч Кісялёў.**

Тав. Кізілейчык агласіў дакументы, паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію, і зачытаў заяву тав. Кісялёва, у якой гаворыцца:

«У акруговую выбарчую камісію Глыбокскай выбарчай акругі па выбарах у Вярхоўны Совет СССР № 612.

Працоўныя Глыбокскай выбарчай акругі аказалі мне вялікую чэсць, вылучыўшы мяне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

Я даю сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР і абяцаю ўсе свае сілы і веды, усё сваё жыццё аддаць на служэнне народу, вялікай справе партыі Леніна—Сталіна».

Разглядзеўшы ўсе паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы, акруговая выбарчая камісія зарэгістравала тав. Кісялёва кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР.

* *

25 лютага днём у м. Глыбокае адбылася першая сустрэча старшыні СНК тав. К. В. Кісялёва з сваімі выбаршчыкамі. На сустрэчы прысутнічала каля чалавек.

* *

Смаргоньская сельская акруговая выбарчая камісія № 426 зарэгістравала кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Сямёна Трафімавіча Кунавіча вылучанага сходамі сялян сяла Вострына і ваколічных вёсак. На пасяджэнні камісіі прысутнічаў тав. Кунавіч, які згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па 426 сельскай акрузе.

Тав. Кунавіч — беспартыйны, селянін-серадняк сяла Войстам. Смаргонскага раёна, былы дэпутат Народнага Сабора Заходнай Беларусі. У мінулым вёў сярод сялян палітасветную работу, арганізаваў у 1926 годзе беларускі спажывецкі аператыўў «Прана». У 1929 годзе за выступленне на вечарыны, прысвечаным 8-ай стрычнічнай сацыялістычнай рэвалюцыі, быў арыштаваны і кінут у гурму. Сядзеў у Лукішках, Вронках і Картуз-Бярозе. Толькі Чырвоная Армія вызваліла панскага засценка.

Дом соцкультуры ў выбарчай кампаніі

З наступленнем змяркання вокны глыбокага раённага Дома соцкультуры мігцяць яркімі агнямі. Прасторнае памяшканне напаўняецца людзьмі. Пасля працы сюды прыходзяць правесці свой вольны час мужчыны, жанчыны, моладзь. Адны чытаюць газеты, журналы, кнігі, другія гуляюць у шахматы, даміно, вучацца іграць на музыкальных інструментах.

Пры Доме соцкультуры працуюць яўрэйскі і беларускі харавыя гурткі. Харавыя калектывы спяваюць беларускія, рускія і яўрэйскія народныя песні, разучваюць новыя совецкія песні. Струнны калектыў, у якім удзельнічае звыш 50 чалавек, часта выступае перад насельніцтвам горада. Вялікіх поспехам карыстаецца драматычны гурток, які паставіў п'есы «Рэбяты гарадскіх вуліц», «Зямка Копач» і іншыя.

Добра працуе духавы аркестр. З кожным днём яго састаў пашыраецца за лік працоўнай моладзі. Духавым аркестрам вывучаны песні «Тры танкісты», «Масква-майская», «Канюша» і рад іншых.

Кіраўнікі гурткоў самадзейнасці Локах, Адлер, Пякарскі з любоўю і ўзнасцю выконваюць даручаную ім справу, дапамагаюць моладзі авалодваць культурай. Пры Доме працуе таксама фото-і шахматны гурткі.

Вялікую работу Дом соцкультуры вядзіць у сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і Арганізаван рад гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. Для лепшага абслугоўвання выбаршчыкаў больш далёкіх пунктаў арганізавана спецыяльная агітпавозка з літаратурай, наглядным фотадакументамі, дыяграмамі.

Пры Доме соцкультуры выходзіць сценная газета «За соцыялістычную культуру», якая трымае цесную сувязь з выбаршчыкамі, паказвае вопыт работы перадавых агітатараў і прапагандыстаў.

Загадчык раённага Дома соцкультуры тав. Ільяшэвіч зробіў арганізаваць сябе актыўу моладзі, разгарнуў шырокую палітычна-масавую работу і заслужана рыстаецца павагай у насельніцтва горада.

С. Я. КРЫВІЧАНСКІ.

Памяці Н. К. Крупскай

(ДА ГАДАВІНЫ З ДНЯ СМЕРЦІ)

Надзежда Канстанцінаўна Крупская належала да таго пакалення, якому прыходзілася ўступаць на арэну грамадскага жыцця ў другой палавіне васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя. Гэта быў час самай жорсткай рэакцыі. Частка тагочаснай моладзі рэзка павярнула ўправа; рэволюцыйныя традыцыі «сямідзесятнікаў», «клопаты аб меншым браце» былі адхілены. Гэтая моладзь думала толькі аб сваім асабістым добрабыце, аб сваёй кар'еры. Другая частка моладзі пад уплывам старэйшага пакалення, не ўсвяломіўшага прычын разгрому рэволюцыйнага руху, выкінула лозунг «малых спраў».

Перад Надзеждай Канстанцінаўнай стала пытанне: па якому шляху ісці?

Ёй здавалася, што на Вышэйшых жаночых курсах, якія ў той час адкрыліся, яна зможа знайсці адказ на мучыўшыя яе пытанні. Яна паступіла на гэтыя курсы. «Праз два месяцы я вельмі расчаравалася ў іх. Убачыла, што таго, што мне трэба, курсы мне не дадуць, што там вучаць вельмі вучоным рэчам, але вельмі далёкім ад жыцця». (Н. Крупская, «Маё жыццё», стар. 14).

У той час у Пецербургу існавалі гурткі самаадукацыі. Надзежда Канстанцінаўна трапала ў такі гурток, стала чытаць Маркса і, як яна сама потым гаварыла, «зразумела што змяніць жыццё можа рабочы рэволюцыйны рух, што для таго, каб быць патрэбнай, карыснай, трэба аддаваць усе свае сілы рабочай справе». (Там-жа).

Каб дабрацца да рабочых,—а гэта пры тагочасных паліцэйскіх умовах было вельмі цяжка,—Н. К. Крупская паступіла настаўніцай у нядзельную вячэрнюю школу ў с. Смаленскім, дзе яна прапрацавала пяць год. А калі ўзнікла сацыял-дэмакратычныя гурткі, у якіх вывучаўся марксізм, Надзежда Канстанцінаўна ўступіла туды. Каля трох год працавала ўжо ў гэтых гуртках Надзежда Канстанцінаўна, калі ў Пецербург прыехаў Уладзімір Ільіч. З гэтага часу нямысліма аддзяліць жыццё Надзежды Канстанцінаўны ад

жыцця Уладзіміра Ільіча, як нямысліма адрэзаць жыццё Леніна ад жыцця партыі.

Прыезд Леніна ў Пецербург адразу адбіўся на ўсім рабочым руху. Разрозненыя марксісцкія гурткі былі аб'еднаны. Узнік «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа». Побач з прапагандай у гуртках Ленін высунуў пытанне аб масавай агітацыі. Складаліся і друкаваліся лістоўкі. Знаёмства Надзежды Канстанцінаўны з рабочымі, якія наведвалі яе курсы ў Смаленскай школе, нямала спрыяла разгортванню масавай агітацыі.

Сярод членаў «Саюза» Надзежда Канстанцінаўна была адной з актыўнейшых. Калі ўзнікла небяспека арышту Леніна і іншых і стала пытанне аб захаванні сувязей у выпадку арыштаў, то «наследніцай», як тады называлі, падпольнай работы і сувязі з рабочымі была намечана Надзежда Канстанцінаўна.

Спакойная, вытрыманая, усвоіўшая ўсе правілы канспірацыі, яна пасля арышту Леніна ўстанавіла з ім сувязь, атрымліваемыя ад яго канспіратыўным шляхам прокламацыі здавала ў падпольную друкарню, не спыняючы ў той-жа час падпольнай работы сярод рабочых. Рэзультаты гэтай работы былі па таму часу велізарны. Надзежда Канстанцінаўна разам з таварышамі, якія асталіся на волі, удалося арганізаваць настолькі ўнушальную забастоўку пецербургскіх ткацтыльшчыкаў, што ўрад вымушан быў для супакаення рабочых выдаць законы аб ахове працы жанчын і аб рабочым дні... Але адначасова арганізатары забастоўкі, і ў першую чаргу Надзежда Канстанцінаўна, былі арыштаваны.

Сем месяцаў прасядзела Надзежда Канстанцінаўна ў турме. Яе павінны былі адправіць у ссылку ва Уфімскую губерню, але ёй удалося дабіцца дазволу адбываць ссылку ў с. Шушэнскім, куды саслалі Леніна.

Царскае самадзяржаўе ізаляцыяй рэволюцыянераў ад масы прабавала аслабіць рабочы рух. Тупы і абмежаваны царызм не разумеў што такіх дзеячоў, як Ленін нельга адарваць ад рабочага рэволюцыйнага руху. З далёкай ссылкі па ініцыятыве Леніна і пад яго кіраўніцтвам быў складзен калектыўны пратэст супроць анархістычнага «Крэда»; у ссылцы Ленін працаваў над «Развіццём капіталізма ў Расіі»; у ссылцы Надзежда Канстанцінаўна напісала работу «Жаночая работніца»; нарэшце, у ссылцы Ленін абмяркоўваў з Надзеждай Канстанцінаўнай планы арганізацыі за граніцай агульнарускай газеты рэволюцыйных марксістаў. То была потым створаная Леніным славутая «Искра», у ёй Надзежда Канстанцінаўна была сакратаром, вяла перапіску з шматлікімі падпольнымі гурткамі, якія Ленін еднаў у цэнтралізаваную партыю.

Такую-ж работу Надзежда Канстанцінаўна вяла і ў газеце «Вперед», створанай Леніным, калі меншэвікі захапілі «Искру». Па сутнасці, гэта быў удзел у збіранні і аб'еднанні раз'яднаных і раскіданых па ўсёй Расіі марксісцкіх сіл. Надзежда Канстанцінаўна праявіла сябе як буйнейшы арганізатар. І ў часе рэволюцыі 1905 года, і пасля разгрому маскоўскага снежаньскага паўстання, і ва ўсе самыя цяжкія мінуты ў жыцці партыі, аж да Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі, Надзежда Канстанцінаўна выконвала арганізацыйныя функцыі партыйнага цэнтра. Яна перадавала дырэктывы Леніна і ЦК падпольным камітэтам, яна дапамагала наладжваць сувязі, давала яўкі, запытвала, напамінала. Мы ўсе памятаем поўныя непакою запросы Надзежды Канстанцінаўны аб здароўі таварыша Сталіна—то Ленін цікавіўся месцапрабываннем і самаадчуваннем свайго лепшага сяратніка і друга, яго падвяргаўся штомінутнай небяспецы.

Расла большэвіцкая партыя, рос яе ўплыў у рабочых масах, і ў гэтым было нямала працы вернага і нястомнага памочніка вялікага Леніна — Надзежды Канстанцінаўны.

Яшчэ ў годы падполля і эміграцыі Надзежда Канстанцінаўна глыбока вывучала пытанні народнай асветы, многа і пладатворна працавала ў галіне міжнароднага жаночага комуністычнага руху. Пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі Надзежда Канстанцінаўна, старая настаўніца рабочых школ, старэйшая большэвічка, цалкам аддаецца барацьбе за культуру, за народную асвету. Яна становіцца членам калегіі а затым намеснікам народнага камісара асветы.

Знясіленая, эмораная пяжкімі годамі падполля і эміграцыі, Н. К. Крупская вяла велізарную, алкаўную работу, не лічачыся з сваім здароўем. Яна часта хварэла, і гэта непакоіла Уладзіміра Ільіча; урачы настойвалі на адпачынку, але грамадзянская вайна была яшчэ ў разгары, і Крупская замест таго, каб адпачыць, адправілася ў агітацыйную паездку на параходзе «Красная звезда» па Волзе і Каме. І так ўсе годы.

Зараз, калі пад кіраўніцтвам вялікага правадыра працоўных таварыша Сталіна ў нашай краіне выраслі шматлікія кадры совецкай социялістычнай інтэлігенцыі, плоць ад плоці працоўных, у асяродзі нашай народнай інтэлігенцыі, выхоўваемай у духу марксізма-ленінізма, пачотнае месца займае настаўніцтва.

У тыя годы, калі Крупская пачынала працаваць па народнай асвеце, настаўніцтва ў сваёй большасці было другое. Яго прадстаяла яшчэ перавыхаваць. І роля Надзежды Канстанцінаўны ў гэтай справе надзвычайная.

Калі дадаць да гэтага многагранную дзейнасць Надзежды Канстанцінаўны ў галіне комуністычнага выхавання жанчын—работніц і сялянак; яе работу з дзецьмі; яе пастаянныя клопаты аб хатах-чытальнях, аб бібліятэках; сотні газетных і журнальных артыкулаў напісанных ёю для рабочых, сялян, інтэлігенцыі; яе імкненне ажыццявіць краязнаўчыя музеі і т. д. і т. д. — то нельга не здзіўляцца: дзе брала яна сілы, як магла справіцца з разнастайнымі справамі гэтая сапраўды нястомная асветніца?

Сілы ёй прыдавала яе невычарпальная вера ў народ, у вялікую справу Леніна—Сталіна, пад сцягам якой яна самаадданна змагалася.

Яна была любімицай мас, любімицай партыі. Усе ведалі што большэвіцкая партыя для яе—усё. З самым блізкім чалавекам яна рвала, калі ён ухіляўся з ленінскага шляху. А лепшым другам яе мог быць толькі той, хто ўсяго сябе аддае справе партыі. Чым была для гэтай нястомнай тружаніцы партыя, сведчыць мяжуючае з подвігам яе выступленне на II з'ездзе Совецкаў, калі яна, адарваўшыся ад труны Леніна, з'явілася на трыбуну ў Вялікім тэатры з заклікам: «Шэй палымяйце дарагі Леніну спяг, комунізма!»

Пасля смерці Леніна барацьба за ажыццяўленне яго запветаў прыдала ёй перанесці гэтае страшнае гора. Да сваёй смерці Надзежда Канстанцінаўна прадаўжала працаваць пад кіраўніцтвам вялікага прадаўжальніка справы Леніна Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Сведка і ўдзельніца зараджэння і ўзрастання партыі большэвікоў, Н. К. Крупская пад сцягам Леніна—Сталіна каля дзесяцігоддзяў змагалася за справу перамогі чага класа і дажыла да сусветна-гістарычных перамог социялізма.

У канцы 1937 года ў Серпухаве на перавыбарным сходзе сваіх выбаршчыкаў Н. К. Крупская гаварыла:

«На маю долю выпала вялікае шчасце бачыць, як наша краіна з краіны цёмнай, з краіны, затопленай царызмам, памешчыкамі і капіталістамі ператварылася ў краіну социялізма. Гэта найвялікшае шчасце. Зараз, калі прыходзіцца прысутнічаць на цэлым разе дзяў і бачыць, як згуртаваны нашы масы, з якой любоўю яны адносяцца да партыі, з якой любоўю яны ўспаміна Леніна, з якой любоўю адносяцца да таварыша Сталіна, да кіраўніцтва нашай партыі,—у такія моманты, таварышы, я адчуваю асаблівую радасць...»

Смяртэльна хворая, яна пралаўжала мець аб партыі, аб прадстаячым XVIII з'ездзе, прасіла ўрачоў паскорыць лячэнне, каб яна магла ўдзельнічаць у гэтым вялікім з'ездзе. Але на гэты раз яе не ўдалося выратаваць.

Год таму назад, 27 лютага, напярэдні XVIII партыйнага з'езда, перастала біцца сэрца вялікай гружаніцы, прысвяціўшай сваё жыццё справе народа. Але памяць аб Надзежде Канстанцінаўне не памрэ, яна яе жыве ў сэрцах працоўных, яны захаваюць памяць аб ёй.

Фелікс КОН.

...АЛІ БУДЗЕ ЗАКОНЧАНА БУДАЎНІЦТВА МІНСКАГА ВАКЗАЛА?

...адзін з веснавых красавіцкіх дзён ...ыры паяздоў далёкага следвання, ...аджаючы да Мінска, былі здзіўлены. ...ныя закрыта. Прывакзальная пло... ...акаймлёна драўляным плотам. Вакз... ...ка ўзнімаюцца высокія рыштаванні. ...чалася рэканструкцыя вакзала. Пе... ...будаўнікамі была пастаўлена вы... ...на адказная задача — новы вакзал ...ен быць гатоў да XXII гадавіны ...ычніцкай рэволюцыі. І яны з пер... ...жа дзён разгарнулі інтэнсіўную ра...

...мчасам ішла праверка чарнёжоў і ... Выявілася, што праектыроўшчыкі ...ілі рад важных работ. Будаўнікі за... ...валі праекты электраасвятлення, вен... ...цыі і інш. Заказчыку — Упраў... ...о Заходняй чыгункі—было адразу-ж ...ўлена патрабаванне — неадкладна ...абіць праект і павялічыць неабход... ...асігнаванні. Намеснік начальніка чы... ...гав. Суораў згадзіўся з гэтым і ...ў здань праект да 15 ліпеня.

...айшло чатыры месяцы. Нямала было ...а паперы. Папкі набухалі бесліччнай ...асцю дакументаў. Ужо набліжаўся ...н сканчэння будаўніцтва вакзала, а ...ст яшчэ не быў гатоў. Толькі ў ка... ...ніку ён быў канчаткова запверджан. ...чаліся непаладкі і на самой будоўлі. ...к работ зрываўся. Упраўленне чы... ..., абавязаўшаяся па дагавору само ...печыць будаўніцтва ўсімі неабход... ... матэрыяламі, грубейшым чынам на... ...ла ўмову. На будоўлі нехапала лесаматэрыялаў, цэмента, жалезных балак.

...ліпеня быў састаўлен акт, у якім ...чалася, што будаўніцтва вакзала ...асцюа па віне заказчыка. Гэты даку... ...е падпісаў начальнік вакзалаў чыгун... ...ав. Афанасьеў. Але па сутнасці нічога ...мянялася. Першы тэрмін сканчэння ...ніцтва быў сарван. Кіраўнікі чыгун... ...змянілі сваіх абыякавых адносін да ...зы, закранаючай інтарэсы тысяч ...оўных Совецкай Беларусі.

...адзін раз пытаннямі будаўніцтва ...ала займаліся мясцовыя арганізацыі. ...тудзеня гэтага года адбылася нарада ...Мінскім аблвыканкоме, на якой быў ...хан даклад камісіі, абследаўшай ...овішча будаўніцтва вакзала. Як ні ...а, але намеснік начальніка чыгункі ...Суораў не палічыў патрэбным з'я... ...ь на параду.

Праз два гады аблвыканком зноў абмяркоўваў гэта пытанне. Было прынята рашэнне — прапанаваць Упраўленню чыгункі забяспечыць будаўніцтва вакзала ўсімі матэрыяламі і закончыць яго да 1 ліпеня Тав. Суораў зноў (ужо ў які раз!) падпісаў дагавор, па якому абавязаўся не пазней 1 сакавіка даставіць на будаўніцтва ўсё неабходнае. Але тав. Суораў, які з незвычайнай лёгкасцю дае абяцанні, і на гэты раз не выконвае ўзятае на сябе абавязацельства. На будаўніцтве па-ранейшаму зацішша.

Па віне Упраўлення чыгункі якое не забяспечыла вакзал палівам, будаўніцтва было спынена на паўтара месяца. Работы аднавіліся толькі 20 лютага.

Упраўленне чыгункі мела ўсе магчымасці для своечасовага забеспячэння будаўніцтва вакзала першаступеннымі матэрыяламі. У гэтым яму аказвалі ўсямерную дапамогу і сакрэтарыят рэспубліканскія і абласныя арганізацыі. Рашэннем СНК БССР ад 19 снежня 1939 г. чыгунцы было выдзелена 1.000 кубаметраў лесу ў Полацкім раёне, размешчанага ў 7 кілометрах ад бліжэйшай станцыі. Аднак лес да гэтага часу не вывозіцца. Характэрна, што кіраўнікі чыгункі адмовіліся ад прапановы Мінаблбудтрэста, які вядзе будаўніцтва, вывезці гэты лес сваімі сіламі.

Пры праяўленні пэўнай ініцыятывы і зацікаўленасці можна знайсці ў рэспубліцы і абліцовачныя пліткі (на Копыскім кірпічовым заводзе) і дубовыя дошкі, у якіх адчуваецца вялікую патрэбу будаўніцтва. Але ўся бяда ў тым, што Упраўленне чыгункі не жадае займацца будаўніцтвам Мінскага вакзала.

Здзіўляючую пазіцыю занялі партыйныя арганізацыі Мінскага аддзялення Заходняй чыгункі (нач. палітаддзела тав. Міронаў). Яны ні разу не пацікавіліся будаўніцтвам...

Сталіца БССР павінна мець узорна абсталяваны вакзал, у гэтым зацікаўлены прапоўныя ўсёй рэспублікі. Кіраўнікі Заходняй чыгункі (начальнік тав. Гарнык, нач. палітаддзела тав. Марчанка) павінны, нарэшце, перайсці ад слоў да справы і прыняць усе меры, каб вакзал быў закончан у самы бліжэйшы час.

І. ТУРЭЦКІ.

ВЫДАТНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ

...обрых поспехаў у сваёй рабоце дабі... ...работнікі Мінскай пагрузачна-разгру... ...ай канторы. Машыніст пад'ёмнага ...а т. Баркун за апошнія дні сістэма... ...та дае 8—10 норм за змену. Днямі ...а 2 гадзіны разгрузіў вяртушку тор... ...ў колькасці 21 вагон, выканаўшы за... ...е на 1.746 процантаў.

...аборнічаючы з т. Баркуном, машы... ...ніст пад'ёмнага крана, капыдат партыі т. Івановіч у дні выбараў кіруючых партыйных органаў навысіў сваю выпрацоўку да 1.390 процантаў нормы.

Выдатныя паказальнікі даюць грузчыцы Мілаеня Анастасія і Сіцко Елізавета. Яны выконваюць свае нормы на 400 процантаў кожная.

Н. С.

АБ НЕПАТРЭБНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

...ртыкулы «Правды» аб ушчыльненні ...чага дня служачых і скарачэнні штата... ...ырока абмяркоўваліся сярод работ... ...ў установаў Крупскага раёна. У нашым ...е таксама ёсць арганізацыі, якія сваім ...ваннем не прыносяць ніякай карысці, ...лькі гарэмна растрачваюць дзяржаўн... ...сродкі.

...агатоўкамі дзікарастучых ягад, гры... ...і лекавай тэхнічнай сыравіны ў ра... ...займаюцца некалькі арганізацый: рай... ...Белпалагарэдніна, Ленгаатгандаль, ...сервазбыт, Талачынскі вінзавод. У га... ...арганізацыях працуюць 10—12 ін... ...ктараў і больш 30 загатавіцеляў, што ...ходзіцца дзяржаве ў 15—20 тысяч ...лёў у месяц. Своечасабліва канкуры... ...чы паміж сабой, гэтыя арганізацыі ...раюць сапраўды ажыятаж на рынку. ...спрачна што ўсімі гэтымі загатоўкамі, ...яшчэ са значна большым поспехам, ...ла-б займацца адна загатоўчая арганізацыя.

...агатоўкамі мяса і птушкі займаюцца ...ыры арганізацыі: сельпо, Заготмяса, ...акамбінат і Яйкаптушкамбінат. Сельпо закупае мяса, здае Заготжывёле, якая ў сваю чаргу перадае яго мясакамбінату. І пры кожнай такой перадачы жывёла трапіць ва ўкормленасці. Каб перавыканаць свой план, кожны загатавіцель стараецца перахапіць жывёлу ў другога, у выніку чаго ўзвінчваюцца цэны. Бываюць выпадкі, калі ў адзін і той-жа калгас прыязджаюць адначасова па пяць загатавіцеляў.

Загатоўкі ўцілю праводзяць Уцільсыравіна, сельпо і іншыя арганізацыі. Кожная з іх мае штаты. Транспарт абыходзіцца дзяржаве ў дзесяткі тысяч рублёў. Між тым, адна з гэтых арганізацый магла-б поўнасцю ахваціць усю работу па загатоўцы ўцілю.

Пара ліквідаваць лішнія загатоўчыя ўстановы, як'я сябе не апраўдваюць! Зрабіўшы гэта, мы зможем даць нашай краіне лепшай якасці і больш тавараў прадукцыю і, апрача таго, аслабанім значную колькасць работнікаў, у якіх адчуваюць патрэбу іншыя арганізацыі.

БАГДАНОВІЧ, КЛЯЦКО, РАКАВЕЦ.

КАНДЫДАТЫ ВЫЗВАЛЕНАГА НАРОДА

★

Сяргей Прытыцкі

Хлопчыкам Сяргей Прытыцкі пасвіў кароў у кулака. Хутар, на якім жыў Сяргей, знаходзіўся далёка ад роднай вёскі. Пасвіць жывёлу прыходзілася аднаму без рэбят, на ўзлеску. Было адзінокаму пастушку маркотна і сумна. Ляжа пастушок на траву, загледзіцца на нябесную сінь ды і засне. Гаспадар, награнуўшы ў такія мінуты, падымаў яго ўдарам біча...

Сяргею было тады 12 год. Каб не заснуць, ён спяваў песні, раздумваў аб розных рэчах. Ляжаў, глядзеў на воблакі і пытаў сябе: хто-ж, напрыклад, вывешвае чырвоны сцяг на крыжу за вёскай у дні 1-га мая і 7 лістапада? Гоніць, бывала, Сяргей кароў, заўважыць чырвоны сцяг або плякат на прыпарожным крыжу і думае: «Гэта, напэўна, комуністы вывешваюць. Ах, каб убачыць жывога комуніста...»

Ад старэйшых Сяргей ведаў, што комуністы—асаблівы народ. Яны не баяцца ні пакоў, ні паліцыянтаў. Яны сядзяць у турмах, іх вешаюць і расстрэльваюць, іх б'юць гумамі (гумавымі палкамі), а яны ўсё-такі робяць сваю справу.

У тыя гады Сяргей уяўляў сабе комуністаў людзьмі асаблівай пароды: высокімі, моцнымі, смелымі, з тварам суровым і строгім.

Старэйшы брат Аляксандр прымусіў часам дамоў падпольную літаратуру. Даваў чытаць Сяргею піонерскія кніжкі — на беларускай і рускай мовах. Схаваўшы кніжкі за пазуху, хлопчык уносіў іх з сабой на пасьбішча. Ляжаў там на лугу, чытаў пішком, заведаўся, як жывуць дзеці Совецкага Саюза... Ляжыць, ляжыць ды і расплачацца раптам ад зайздрасці.

У тую пару сазрэла ў Сяргея мысль упячы ў Совецкі Саюз Рашыў упякаць разам з адным з прыяцеляў рэбят — Іванам Кастэцкім. Дасталі нават крыху грошай. Але калі Сяргей прышоў аднойчы вечарам да Івана, каб разам ісці да граніцы, — таварыш струсіў. Так і не збыўся іх план.

Як і ўсе сялянскія падросткі, Сяргей ненавідзеў паліцыю. Для беларускіх сялян галоўным прадстаўніком акупантаў быў паліцыянт. За кожнае глупства ён збіваў сялян, арыштоўваў. Калі паліцыянт праходзіў па вуліцы. Сяргею заўсёды хацелася кінуць у яго камень.

Вучыўся Сяргей у польскай школе, якая змяшчалася ў суседняй вёсцы. Настаўнік Кржыжаноўскі расказваў вучням аб польскіх каралях. Сяргей зненавідзеў гэтых каралёў. Аднойчы яго пакінулі без абеда, і пакараны школьнік падраў вісеўшыя ў класах партрэты Пілсудскага і Масьпіцкага. Калі Сяргей не прышоў у школу 1 мая, настаўнік удасыў яго па твары і затым высек. Гэты польскі «выхаванець» Кржыжаноўскі меў доўгі конскі твар, маленькія, рыскаючыя ва ўсе бакі вочкі. Пазней, калі Сяргей сустракаў шпікаў, ён заўсёды успамінаў гэтую фізіяномію.

Пасля школы Сяргей працаваў батракам і разам з бацькам—пільшчыкам. У 1931 годзе ён уступіў у комсамол. Было гэта так. Падышоў да Сяргея таварыш і гаворыць:

— Сярожа, вышла так, што няма каму ісці на сход. Сходзі ў мястэчка Крынка, там будзе сход.

Сяргею далі пароль, аб'яснілі правілы канспірацыі і адправілі. Цёмнай ноччу на балоце, у адзінокай старожцы адбылася раённая комсамольская канферэнцыя. Тут упершыню ўбачыў Сяргей не толькі жывога комуніста, але нават прадстаўніка ЦК...

Канферэнцыя прадаўжалася ўсю ноч і была прысвечана падрыхтоўцы дэманстрацыі 1 мая...

З гэтага дня пачалася актыўная рэволюцыйная дзейнасць выдатнага сына беларускага народа Сяргея Прытыцкага. Ён аддаў сябе ўсяго падпольнай рабоце. На сельскіх могілках, у лесе, а зімой— у якой-небудзь хаціне, падвале, завесіўшы вокны і выставіўшы вартавых, праводзіў сходы комсамольцаў Заходняй Беларусі. Сяргей Прытыцкі. Прапаваць было не толькі небяспечна, але і цяжка. Сяргей стаў непазнавальны. На якой-небудзь ве

чарыцы ён пеў песні, весяліўся з рэбятамі, — але галава яго была занята зусім іншым.

Не было з кім параіцца, адзінае кіраўніцтва — кнігі, літаратура. Вельмі многа чытаў.

У 1932 годзе Сяргея Прытыцкага выбіраюць ужо членам Гродненскага падпольнага камітэта комсамола. Ён сустракаецца з радам выдатных неўстрашымых барацьбітоў-падпольшчыкаў, ён вучыцца ў іх. Скрываючыся ад паліцыі і дэфензівы, ён вандруе з вёскі ў вёску, з раёна ў раён. У маі 1933 года дэфензіва арыштавала Сяргея ў мястэчку Озеры. На працягу трох сутак катавалі яго ў гродненскім заспенку. Шэф дэфензівы Скірмунд асабіста збіваў яго і катаваў. Але Сяргей нічога не сказаў, не выдаў ні сябе, ні арганізацыю.

Яго вымушаны былі аслабаніць.

Далей ідуць дні глухога падполля. Паліцыя выстаўляла засады на дарогах — прыходзілася па два, па тры дні хавацца ў лесе. З вёскі ў вёску Сяргей перабіраўся толькі ноччу. Ішоў, прыслухоўваючыся да кожнага шораху.

Наступіў новы перыяд у жыцці Сяргея — ён кіруе падпольнай арганізацыяй Слонімшчыны. Тут разгараецца ўсеагульная стачка лесарубаў і возчыкаў. Сяргей узначальвае гэтую стачку. Паліцыя гоніцца за ім, але ён заўсёды ўцякае ад яе — часам адстрэльваючыся. Тут прышлося яму не раз адседжвацца ў равах, у халодную асеннюю пару, без гарачай стравы. Але сяляне прадаўжалі атрымліваць ад Сяргея ўказанні, і стачка прадаўжалася.

Дзесяць пяжкіх год — самых лепшых год чалавечага жыцця — аддаў Сяргей гэтай барацьбе.

***

27 студзеня 1936 года ў гор. Вільні ў акруговым судзе адбываўся чарговы працэс над комуністамі. Ужо апытаны ўсе сведкі, за выключэннем галоўнага — вяломага правакатара Стрэльчука.

— Паклічце сведку Стрэльчука, — аб'яўляе старшынствуючы.

Усе позіркі прысутных на судзе накіраваны па дзверы, дзе знаходзіліся сведкі, але... Стрэльчук выходзіць у судовую залу з пракурорскага кабінета.

Поўны 30-гадовы бландын, сярэдняга росту, апранут у вельмі добры шэры каснюм. Ён ідзе цвёрдым рашучым крокам да месца сведкаў, аднак яго галава апушчана ўніз. Правакатар не можа глядзець на людзей, якім ён здраджвае. У зале запанавала напружаная цішыня. Ціхім, хрыплым голасам пачынае Стрэльчук свае словы Іуды...

Якуб Стрэльчук — сын буйнага кулака з Бельскага павета. Вучыўся ў польскай школе, служыў у былой польскай арміі, дзе атрымаў чын малодшага афіцэра. У роднае беларускае сяло ён вярнуўся кіраўніком малазёжнай буржуазнай арганізацыі «Стрэлец». Комуністы і комсамольцы, працуючыя ў падполлі, перацягнулі яго на свой бок. Прымусілі распусціць стрэльцоў, уцягнулі ў падпольную работу. Прапаваў Стрэльчук у падпольнай арганізацыі комсамола смела і рашуча. Гэтым ён адразу заваяваў аўтарытэт комсамольцаў. Стрэльчука ўсюды выбіралі ў кіруючыя органы комсамола. Спачатку ён быў сакратаром аднаго з акругкомаў комсамола, потым узначальваў комсамольскую арганізацыю Слоніма, Беластока, Брэста, Баранавіч.

У комсамольскай арганізацыі пачаліся масавыя арышты актыва.

— Гэта справа рук правакатара, — рашалі ўсе. Пачалі сачыць. Усе ніткі вялі да Стрэльчука. У сакавіку 1935 года ён быў канчаткова выкрыт як правакатар. Яго хацелі чыста і гладка «ўбраць».

Але Стрэльчук не даўся. Ён адкрыта перайшоў на службу дэфензіве і, ахоўваемы атрадамі жандараў і шпікаў, ездзіў па раёнах Заходняй Беларусі, выдаваў паліцыі адну арганізацыю за другой. Ён выступаў на сулах у якасці сведкі абвінавачання, здраджваў усім і ўсяк. Ён паслаў па шыбеніцу і катаргу да тысячы чалавек. Сярод іх былі нават радавыя сяляне і сялянкі, якія ніколі не знаходзіліся ў комуністычнай партыі. Сяляне-беднякі, якія кармілі Стрэльчука ў дні падпольных вандраванняў і дзяліліся з ім апошнім кавалкам хлеба, усе, у каго Стрэльчук калісьці начаваў, — пяпер былі ім здраджаны і агавораны.

У дэфензіве Стрэльчук не раз сам, засучыўшы рукавы, збіваў арыштаваных.

Правакатара трэба было знішчыць. Так рашылі астаўшыяся комсамольскія арганізацыі. Але выканаць гэтае рашэнне нікому не ўдавалася. Стрэльчук хаваўся ў логавах дэфензівы і паказваўся толькі на судзе.

Выканаць прыгавор над здраднікам узяўся Сяргей Прытыцкі.

У жыцці Прытыцкі ніколі не сустракаўся з Стрэльчуком. Яны не ведалі адзін аднаго. Гэта аблягчала Прытыцкаму магчымасць прысутнічаць у зале суда, але гэта і затрудняла яму выканаць прыгавор, бо ён не бачыў нават фатаграфіі чалавека, у якога павінен быў страляць.

— Перада мной стаяла трудная задача, але калі трэба, то я гатоў быў забіць яго ў дэфензіве, у судзе, у любым месцы, — заявіў Сяргей.

Ён прыступіў да выканання пяжкай задачы. Яму далі браўнінг. Прытыцкі апробаваў яго. Браўнінг аказаўся ненадзейным. Ён узяў яшчэ адзін браўнінг. Так з двума рэвальверамі прышоў Сяргей Прытыцкі 27 студзеня 1936 года к 9 гадзінам раніцы ў Віленскі акруговы суд, дзе правакатар Стрэльчук рыхтаваўся выдаць новую групу падпольшчыкаў.

...Малады чалавек, у цёмным касцюме, праціскаецца ў залу акруговага суда разам з натоўпам.

— Калі я ішоў у суд, я ведаў, што гэта на 99 процантаў для мяне смерць. Але раз узяўся, значыць трэба ісці...

Большасць з падсудных ведала Прытыцкага асабіста. Яны яго не бачылі каля двух год, і вось цяпер — сустрэча ў судзе. Дзесятак пар вачэй з залы падсудных былі звернуты на маладога чалавека ў цёмным касцюме. Шпікі, сачыўшыя за позіркам падсудных, пачалі рыскаць па зале — каго яны там убачылі з сваіх?

Патрэбна была велізарная сіла волі, каб спакойна, нічым не выдаючы сябе, прасядзець у такіх умовах з 9 гадзін раніцы да 3 гадзін дня. Абвяшчаецца перапынак на абед. Але Прытыцкі з залы суда не выходзіць. Ён сядзіць у застыўшай, нерухомай позе на краю лавы ў задніх радах. Адзін з рэвальвераў ён трымае ў правай кішэні штаноў, другі — на грудзях пад піджакам

6 гадзін сядзеў нерухома Сяргей Прытыцкі. Ён абдумваў кожную дэталь.

Зала перапоўнена. Стрэльчук будзе даваць свае паказанні перад судом. Побач сядзяць падсудныя, адвакаты, журналісты. Страляць трэба так, каб нікога, апрача правакатара, не забіць. І Прытыцкі рашае: падыйсці ўшчыльную да правакатара, з аднаго рэвальвера страляць знізу ўверх, у галаву здрадніка, з другога — у спіну.

— 99 процантаў за тое, што я загіну. Але так хочацца жыць! Як-жа скарыстаць хоць малейшую магчымасць, каб выратавацца?—прадаўжаў думаць Прытыцкі.

Ён паглядзеў па ўваходныя дзверы. Яны запёрты. Абедзве палавінкі дзвярэй, як прыкмеціў Прытыцкі, былі не замацаваны ні знізу, ні зверху. Моцны штурчок — і яны расчыняцца. Прытыцкі ўзважвае кожную дэталь. А Стрэльчук пачаў ужо гаварыць. Набліжаюцца рашаючыя мінуты...

— Вось Стрэльчук гаворыць ужо адну, дзве, тры... пяць мінут.

— Гэта банда, — хрыпіць правакатар, указваючы на падсудных...

У Прытыцкага пацямнела ў вачах. Ён бярэ сябе ў рукі.

— Даволі! — рашае ён.

Хутка ўстае, вымае абодва рэвальверы і ідзе па праходу ўперад. На яго ні хто не звяртае ўвагі. Уся зала прагна глядзіць уперад, слухаючы Стрэльчука. Дайшоўшы да сярэдзіны залы, Прытыцкі рыўком кідаецца ўперад, ударае нагой дзверкі бар'ера, падбягае ўшчыльную да Стрэльчука...

Усё гэта прадаўжалася толькі імгненне. Пракурор і члены суда, убачыўшы чалавека з рэвальверам у руках, хаваюцца пад стол. Стрэльчук не паспеў азірнуцца, як раздаліся выстралы. Здрадзік паваліўся на падлогу. Прытыцкі пусціў у яго яшчэ дзве кулі...

У зале паніка. Усе кідаюцца к выхаду, але дзверы закрыты. Тут скапленне народу. Убачыўшы бягучага да натоўпа Прытыцкага, усе расступаюцца. Ён пахбягае да дзвярэй, ударае ў іх плячом, і яны расчыняюцца. Прытыцкі выбягае на пляцоўку, дзе ўдоўж сцяны стаіць група паліцэйскіх. Яны ў страху падымаюць рукі ўверх і грусліва крычаць:

— Даруй, пан, жыццё!

Прытыцкі бяжыць па доўгай мраморнай лесніцы ўніз, але тут прышоўшыя ў прытомнасць паліцэйскія адкрываюць па ім стральбу. Першая куля папала Прытыцкаму ў бок і, як потым выяснілася, прастрэліла кішкі ў 19 месцах. Ногі падкасіліся, ён упаў на калені, затым кубарам пакаціўся па лесніцы ўніз... Дасягнуўшы пляцоўкі, Прытыцкі бездапаможна распластаўся на ёй. Расхрабрыўшыяся паліцэйскія прадаўжалі страляць. Другая куля прастрэліла Прытыцкаму лёгкія, трэцяя закранула галаву і чацвертая папала ў руку. Адзін з рэвальвераў упаў.

Адважны рэволюцыянер ляжаў у лужыне крыві а паліцэйскія і шпікі ўсё яшчэ прадаўжалі страляць...

Затым стральба спынілася. Прыбеглі следчыя, пракурор. Жандары наваліліся на грудзі сцякаючага крывёю падпольшчыка, прылавілі ботам руку, стараліся вырваць другі рэвальвер. Разарвалі піжак, вопратку, рабілі старанны вобыск.

— Хто ты? — было першае пытанне.

Абяссілеўшы, лічачы, што ён гіне, Прытыцкі рашыў назваць сваё сапраўднае імя.

— Прытыцкі Сяргей!

Ён ляжаў на каменнай падлозе, адчуваючы ў жываце нязносны востры боль. Здавалася, што ўнутры ў яго гарыць распаленае жалеза. Адзервянела правая нога, мучыла прага.

— У каго ты страляў? — не адставаў ад яго следчы.

— У правакатара...

— Хто вынес яму смяротны прыгавор?

— Ён сам.

— Хто пябе паслаў?

— Ніхто. Я сам...

Праз паўтары гадзіны прыбыла карэта хуткай дапамогі. Але Сяргей Прытыцкі яшчэ жыў. Яго неслі да аўтамабіля хуткай дапамогі праз плошчу, тую самую плошчу, на якой у 1863 годзе вешальнік Мураўёў павесіў беларусаў-рэволюцыянераў, у тым ліку легендарнага народнага героя Кастуся Каліноўскага.

На плошчы сабраўся вялікі натоўп. Прытыцкі падняўся на насілках і, звяртаючыся да народа, закрычаў:

— Далоў польскіх паноў! Смерць правакатарам! Няхай жыве пролетарская рэволюцыя!

Паліцэйскія прыціснулі яго да насілак, і санітары хутка пабеглі да аўтамабіля.

У больніцы Прытыцкага паклалі на аперацыйны стол. Урачы адмовіліся зрабіць аперацыю, лічачы яе бескарыснай. Але загадана аперыраваць.

Прытыцкі ў больніцы. Жуласны боль мучыць яго. У мазгу паяўляюцца злані. Успомнілася роднае сяло Гаркавічы і гара Стасюліха, якая жывапісна ўзвышаецца над акругай, дзе прайшлі дзіцячыя гады Сяргея. Яму здаецца, што гара рухаецца на маленькага Сяргея, яна ўсім цяжарам навальваецца на яго, ён трашчыць прытомнасць...

Прытыцкі выжыў. Пастаў день, калі ён адчуў сябе лепш.

— Ах, вы прачнуліся, вы будзеце жыць, а мы так непакоіліся аб вашым лёсе, — пачуўся салодкі голас шпіка, пераадзетага ў белы халат.

Потым пачаліся бясконцыя пакутлівыя допыты, якія працягваліся цэлымі гадзінамі і знясільвалі хворага.

— Прызнайся, або павесім, — пагражаў яму пракурор Вольскі.

Прытыцкага пачалі лячыць, каб павесіць. Праз месяц лячэнне спынілі і накіравалі ў турму. Буржуазны суд прыгаварыў рэволюцыянера да павешання. 10 месяцаў сядзеў Сяргей Прытыцкі ў камеры смертнікаў, чакаючы кожны момант прывядзення прыгавора ў выкананне. Але на яго абарону паўстаў народ Заходняй Беларусі, народы ўсіх краін. У Амерыцы быў створан камітэт абароны Прытыцкага. Пад націскам народнага гневу польскія ўлады замянілі Прытыцкаму смяротны прыгавор пажыццёвым зняволеннем.

...Калі мы сядзім зараз у будынку былога ваяводства і гутарым з намеснікам старшыні Беластоцкага аблвыканкома Сяргеем Прытыцкім, які ўсяго толькі пяць месяцаў таму назад вышаў з польскай катаржнай турмы, то нам не верыцца, што гэты жыццерадасны чалавек прайшоў такі цяжкі шлях.

Прытыцкі на працягу ўсяго свайго свядомага жыцця смела і няўтомна змагаўся супроць польскіх прыгнятальнікаў, захваціўшых 20 год таму назад яго родную Заходнюю Беларусь. Чалавек адчайнай смеласці і вялікай мужнасці, які перанёс за дваццаць сем год свайго жыцця мноства ліцэнзіяў, пакут, катаванняў, як і ўсякі рэволюцыянер, любіў марыць.

Ён палка верыў, што настане вялікі дзень вызвалення ад іга прыгнятальнікаў.

Але рэчаіснасць пераўзыйшла ўсе яго думы і надзеі. Чырвоная Армія ажыццявіла заветную мару прапоўных заходніх абласцей Беларусі аб вызваленні іх ад гнёту польскіх паноў куды раней, чым думаў аб гэтым малады пастушок Сяргей Прытыцкі.

Астатняе чытачу ўжо вядома. Сяргей Прытыцкі быў адным з актыўнейшых дэпутатаў гістарычнага Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Ён быў, нарэшце, членам Паўнамоцнай Камісіі. Ён закладваў Надзвычайнай Пятай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР у Маскве аб рашэннях народаў Заходняй Беларусі. Ён бачыў вялікага Сталіна.

І. ПАУЛАЎ.

РЫХТАВАЦЬ КАНЯ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

...У соцыялістычнай сельскай гаспадарцы ...бароне нашай квітнеючай совецкай ра... ...ны каню належыць выключна вялікая ...я. XVIII партыйны з'езд з усёй рашу... ...цю адзначыў наша адставанне ў раз... ...ці конегадоўлі і ў сваіх рашэннях па... ...віў перад краінай задачу — павялі... ...ць да канца трэцяй пяцігодкі пагалоўе ...ней на 35 процантаў.

...Сотні калгасаў Совецкай Беларусі, ...конваючы рашэнні партыі і ўрада па ...звіцю конегадоўлі, дабіліся велізарных ...спехаў. Чатыры калгасныя конегадоў... ...я фермы, удзельнікі Усесаюзнай сель... ...гаспадарчай выстаўкі 1939 года, уда... ...ены высокай ацэнкі сваёй работы узна... ...роджаны дыпломамі другой ступені, пра... ...раваны грашыма і матапыкламі. Сярод ... — конегадоўчая ферма калгаса «Звяз... ...» Заслаўскага раёна, якая вырасціла ...95 жарабят на кожныя 100 конематак, ...негадоўчая ферма калгаса імені Карла ...аркса, Багушэвіцкага раёна, вырасціў... ...я па 95,5 жарабя на кожныя 100 ко... ...матак, конегадоўчыя фермы калгаса ...ені Леніна, Гомельскага раёна, і «Герой ...працы», Заслаўскага раёна.

...Большэвіцкія ўзоры работы па вырашч... ...нню конскага пагалоўя і падрыхтоўцы ...ня да сяўбы паказваюць калгаснікі ...льскагаспадарчай арцелі «Чырвоны пу... ...лавец», Тураўскага раёна. Зголна дзяр... ...ўнага плана развіцця конегадоўлі, кал... ...ас павінен быў мець да канца 1939 года ...60 коней. Калгас не толькі паспяхова ...выканаў гэты план, але і намнога яго ...перавыканаў, давёўшы пагалоўе коней да ...88 галоў. За коньмі арганізаван узорны ...оглян. Створана добрая кармавая база.

...У рэспубліцы добра вядомы імёны лен... ...ных конюхаў—дэпутата Вярхоўнага Со... ...ета СССР Нікіты Батоўкіна з калгаса ...«Кастрычнік», Прапойскага раёна, Ніка... ...лая Бязева з калгаса імені Леніна, Чавускага раёна. Дзяміда Казейчыка з калгаса «Гігант», Рэчыцкага раёна, і іншых, якія за сваю выдатную работу ў развіцці конегадоўлі ўзнагароджаны Саюзным урадам вышэйшай узнагародай — ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза.

За апошнія годы наша рэспубліка мае некаторыя поспехі ў развіцці конегадоўлі. У параўнанні з 1938 годам у мінулым годзе рост конскага пагалоўя склаў 104,6 процанта, а процант вырашчвання жарабят у параўнанні з 1937 годам павялічыўся да 150,9.

Але такія тэмпы росту конскага пагалоўя з'яўляюцца нізкімі. Дзяржаўны план развіцця конегадоўлі ў калгасах БССР за 1939 год выканан толькі на 94,2 проц., а па вырашчванню жарабят — на 81,5 проц. Асабліва адстаючымі з'яўляюцца Віцебская абласць, якая дзяржаўны план мінулага года па развіццю конегадоўлі выканала на 89,7 проц., па вырашчванню жарабят — на 70 процантаў, і Мінская абласць аднаведна — 93 проц. і 78,8 проц.

Падобнае становішча з развіццём конегадоўлі не выпадковае. У радзе месц яшчэ не зжыты варварскія адносіны да каня і прадаўжаецца так рэзка асуджаная нашай партыяй недаацэнка конскай цягавай сілы. Не ўсюды абласныя і раённыя партыйныя, совецкія і зямельныя арганізацыі аддаюць большэвіцкую ўвагу справе развіцця конегадоўлі.

Да чаго прыводзіць аслабленне ўвагі да калгаснага каня з боку нашых арганізацый, можна паказаць на прыкладзе Любаньскага раёна. Дзяржаўны план развіцця конегадоўлі мінулага года раён не выканаў. Адыход маладняка тут склаўся 16 проц. За мінулы год у раёне загінула звыш трохсот коней. Адсутнасць правільнага догляду і драпежніцкая эксплуатацыя каня — вось прычыны, якія прыводзяць да такога становішча.

У Любаньскім раёне слаба рыхтуюць каня да веснавой сяўбы. Напрыклад, у калгасе «Іскра», Ямінскага сельсовета, паставіна конскага пагалоўя слабай укормленасці. Догляд за коньмі абязлічан. Часта мяняюцца конюхі. Канюшні не ацеплены, за расходаваннем кармоў не ўстаноўлен цвёрды кантроль. Даволі непрыглядная карціна і ў калгасе «Чырвоная змена». Слабодскага сельсовета. Тут справа дайшла нават да таго, што коні зімуюць у ненакрытых канюшнях, а кармы разбазарваюцца направа і налева. Любаньскі раённы камітэт партыі і райвыканком чамусьці праходзяць міма падобных абураючых фактаў.

Любаньскі раён не выключэнне. Не лепш справа і ў Лёзнянскім раёне. Віцебскай абласці, дзе пры праверцы, праведзенай гэтымі днямі, аказалася, што 20 процантаў рабочых коней—слабай укормленасці і зусім не гатовы да веснавых работ. У выніку драпежніцкай эксплуатацыі ў калгасе «Авангард», Окцябрскага сельсовета, у мінулым годзе пала 8 коней і сёлета—2.

За мінулы год у некаторых раёнах рэспублікі мелі месца факты масавага абартавання конематак. У адной толькі Магілёўскай абласці абартавала звыш чатырох тысяч конематак. У калгасе «Чырвоны шлях», Уваравіцкага раёна, абартавала 18 конематак, у тым ліку 7 племянных. Прычыны абартавання крыюцца ў дрэнным доглядзе за жаробнымі конематкамі, няправільным іх кармленні і празмернай эксплуатацыі. Зусім непрымальным з'яўляецца такое становішча, калі жаробныя конематкі ў апошнія месяцы цяжарнасці ў радзе месц не пераводзяцца на лёгкія работы. Вось, напрыклад, у калгасе «Коминтэрн», Лёзнянскага раёна конематкі 7—9-месячнай жаробнасці скарыстоўваюцца на пяжкіх работах.

Цяпер пачынаюцца ажаробы. Перад усімі калгаснікамі, асабліва работнікамі конегадоўлі, перад кіраўнікамі раёнаў і абласцей стаіць баявая задача — дабіцца поўнага захавання і вырашчвання маладняка прыплода гэтага года.

З кожным днём набліжаецца вясна. Поспех высокаякаснага правядзення сяўбы і ўсіх сельскагаспадарчых работ будзе залежаць у першую чаргу ад правільнага спалучэння работы трактара з канём. Гэтага нікому не дано права забываць. Трэба рашуча пакончыць з недацэнкай конскай цягавай сілы, якая мае месца ў многіх калгасах і раёнах нашай рэспублікі. Неабходна па-большэвіцку рыхтаваць каня да веснавой сяўбы. Ніяк нельга мірыцца з такім з'явішчам, калі ў калгасах Гомельскай і Віцебскай абласцей адна трэцяя частка конскага пагалоўя нізкай укормленасці.

Асабліва сур'ёзнае значэнне ў падрыхтоўцы каня да сяўбы набываюць кармы. З раду калгасаў паступаюць сігналы аб растранжыраванні кармавых фондаў. Трэба неадкладна ўстанавіць строгае і правільнае расходаванне кармоў. Кіраўнікі раённых і калгасаў не павінны забываць урокаў мінулага года, калі ў асобных месцах у зімовы час кармавыя фонды былі разбазараны, а на вясну цягавая сіла асталася без кармоў.

Удзельнікі Усебеларускай парады перадавікоў сельскай гаспадаркі ў сваім звароце заклікалі конюхаў:

«Таварышы конюхі! Падрыхтуем да вясны сытага, укормленага каня, арганізуем узорны парадак на канюшнях, поўнасцю ліквідуем абязлічку ў доглядзе за канём, забраніруем і захаваем на веснавыя работы высокаякасныя канцэнтраты і грубыя кармы».

Гэты зварот перадавікоў сельскай гаспадаркі знайшоў гарачы водгук сярод многіх конюхаў. Разгортваючы барацьбу за высокі сталінскі ўраджай, за дастойную сустрэчу Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 года, тысячы калгасаў узорна рыхтуюць каня да веснавой сяўбы. Іх прыкладу павінны паследаваць усе калгасы рэспублікі.

Большэвіцкая падрыхтоўка каня да веснавых работ — адна з першачарговых задач усіх калгасаў, соўгасаў, парыйных і совецкіх арганізацый раёнаў і абласцей.

З А Р У Б Я Ж О М

ПРАМОВА ГІТЛЕРА

БЕРЛІН, 25 лютага. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Мюнхена тэкст прамовы Гітлера, друкуемай ніжэй у скарочаным відзе. Прамова была сказана вечарам 24 лютага на ўрачыстым сходзе, прысвечаным 20-й гадавіне асновання нацыянал-соцыялісцкай партыі Германіі.

У сваёй прамове Гітлер напомніў аб тым, як у свой час была абманута Германія, аб 14 пунктах Вільсона, дзякуючы якім германскі народ склаў сваю зброю. «Нас не перамаглі,—заявіў Гітлер.—Германскі народ быў абманут, а яго вера ў магчымасць перабудовы свету была падарвана». Гітлер падрабязна спыніўся на тым, як Англія і Францыя абманулі ў той-жа час увесь свет і перш за ўсё германскі народ і якія вынікі прынёс гэты абман. Толькі знешнія фармальныя абставіны зламілі Германію. Аднак германскі народ не быў зламан. Ён зрабіў вялікую справу ў сусветнай гісторыі, аказаўшы супраціўленне 26 дзяржавам, якія маглі адолець Германію толькі шляхам абману.

Калі мы прышлі да ўлады, мы не хапелі ўзбройвацца. Але мы ўбачылі, што старыя надпальшчыкі вайны зноў рыхтуюцца напасці на нас. У адказ на гэта я таксама пачаў узбройвацца і ўзброіўся так, як гэтага ніколі не было ў гісторыі Германіі.

Указаўшы на дасягненні нацыянал-соцыялісцкага кіраўніцтва, Гітлер падкрэсліў, што цяпер створан гіганцкі будынак, які ніяк нельга параўнаць з дасягненнямі так званых дзяржаўных дзеячоў дэмакратый. Гэтыя людзі пануюць над пераважнай часткаю земнага шара, але яны нават не ў стане знішчыць беспрапоўе ў сваіх уласных краінах. І вось гэтыя старыя нікчэмнасці гавораць цяпер аб перабудове Еўропы.

Пан Чэмберлен, выступаючы ў момант, калі ўся Індыя, уся Аравія пратэстуюць супроць яго, смее заяўляць, што ён павінен прымяніць сілу супроць нашай спробы ажыццявіць сусветнае панаванне Германіі. Такія фразы, быць можа, маглі аказаць уплыў на германскі народ у 1918 годзе, але гэта ніколі не здарыцца ў новай Германіі.

Прэтэнзіі Германіі, заявіў Гітлер, былі вельмі скромнымі. Яны складаліся, папершае, у імкненні забяспечыць германскае жыццёвае прастранства. Германскі народ не дапусціць урэзаць яму гэтае жыццёвае прастранства. Па-другое, Германія патрабавала назад свае калоніі, г. зн. германскую ўласнасць, якую сусветныя плутакраты і адабралі ў яе, без карысці для сваіх уласных народаў. Гэта былі вельмі скромныя прэтэнзіі параўнальна з прэтэнзіямі Англіі і Францыі, прадаўжаў Гітлер. Не гледзячы на гэта, аднак, неўзабаве зноў падняліся нашы старыя праціўнікі перыяда сусветнай вайны. Аднак цяпер супроць іх выступіў такі германскі франтавы салдат, які ажыццявіў усе неабходныя прыгатаўленні, прычым грунтоўна, і які поўны сазнання свайго абавязка ў адносінах свайго народа.

Пасля таго, як Гітлер падкрэсліў нядзейнасць блакады супроць Германіі, ён указаў на тое, што міжнароднае становішча істотна змянілася. Гітлер упамянуў аб дружбе з Італіяй. Далей Гітлер напомніў аб змяненні германа-рускіх адносін. Далей праціўнікаў на тое, што ім уласна распаліць вайну паміж Расіяй і Германіяй, праваліўся. У даным выпадку рускі і германскі рэжымы зрабілі для абодвух народаў нешта благаславеннае. Але мы добра ўяўляем сабе тое, што ў Лондане рвуць сабе валасы ад прыкрасці. Японія таксама не знаходзіцца сёння ў радах праціўнікаў Германіі, наадварот, яна звязана з Германіяй цеснай дружбай. Гэтыя тры гіганцкія дзяржавы захоўваюць добразаканы нейтралітэт у адносінах да Германіі.

Як на далейшую адзнаку змянення абстаноўкі Гітлер указаў на ўзброеныя сілы Германіі, кіраўніцтва і аснашчэнне якіх істотна палепшылася параўнальна з 1914 годам. Тое, што гэта не з'яўляецца пустой фразай, даказаў паход супроць Польшчы, які закончыўся хутчэй, чым гэта чакалі ў Лондане і ў Парыжы. Аднак гэта дакажа яшчэ і будучае.

Далей Гітлер указаў на велізарныя эканамічныя прыгатаўленні Германіі. Аднак цяпер гаспадарчыя асновы Германіі можна лічыць у вышэйшай ступені моцнымі. Германія непераможна як у гаспадарчым, так і ў ваенных адносінах.

Спыняючыся падрабязна на спробах англійскай прапаганды, Гітлер адзначыў, што яна зусім не дзейсная. Германскі народ мае такое-ж права жыць, як і любы іншы народ. Пры гэтым Гітлер асабліва падкрэсліў, што праціўнікі Германіі не маюць сёння за сабой колькаснай перавагі, як гэта яны мелі калісьці, і што германскі народ у даны момант у ваенных адносінах знаходзіцца ў значна лепшым становішчы, чым калі-б та ні было ў сваёй гісторыі. Лёс не дапусціць, каб германскі народ стаў народам рабоў. І сёння я поўны гэтай веры і, далей, з большым правам. Не можа быць інакш: мы павінны перамагчы і таму мы пераможам.

ХТО ДАПАМАГАЕ МАНЕРГЕЙМУ

СТАКГОЛЬМ. Рэакцыйны шведскі друк з усіх сіл прабуе даказаць, што «шведскі народ» выступіў на абарону «фінскай дэмакратыі». Аднак вельмі лёгка пераканацца ў тым, што справа ідзе не аб шведскім народзе, які выступае супроць дапамогі белафінам, а аб невялікай кучцы буйных капіталістаў і банкіраў Швецыі. Так званы аб'яднаны фінляндскі камітэт узначальвае Мальм — старшыня праўлення Булідэн — Рэнцхерскага акцыянернага транспартнага таварыства з капіталам у 250 тысяч крон, бацька старшыня праўлення акцыянернага таварыства чыгункі Данемура — Харт з капіталам у 820 тысяч крон, а таксама старшыня акцыянернага страхавога таварыства Геро з капіталам у 1 млн. крон, старшыня акцыянернага таварыства чыгункі Стакгольм—Рымбу, старшыня акцыянернага таварыства амнібусаў Стакгольмскай губерні з капіталам у 730 тыс. крон, і старшыня акцыянернага шведскага гандлёвага банка з капіталам у 90 млн. крон. Акрамя таго, Мальм—член праўлення Булідэнскага горнага акцыянернага таварыства з капіталам у 42 млн. крон і член праўлення акцыянернага таварыства гідраэлектрычнага будаўніцтва ў Эстэрсунда з капіталам у 1.500 тысяч крон. Такім чынам гэты «абаронца дэмакратыі» з'яўляецца фактычным гаспадаром прадпрыемстваў з капіталам у 137.700 тыс. крон. У якасці члена «камітэта» падвізаецца Вікандэр, мэўшы калісьці свае заводы ў царскай Расіі. Вікандэр — член праўлення акцыянернага таварыства шведскага гандлёвага банка і член праўленняў пяці прамысловых акцыянерных таварыстваў. Ён уладальнік акцыянернага таварыства пробкавай прамысловасці, маючага свае фабрыкі ў Фінляндыі і ў іншых краінах. Капіталы, якімі кіруе Вікандэр і з якіх ён атрымлівае прыбыткі, складаюць 111.759 тыс. крон. Трэцім членам «фінляндска-а камітэта» з'яўляецца Стэдынск — дырэктар і член праўлення шведскага гандлёвага банка. Апрача таго, ён з'яўляецца членам праўленняў 8 прамысловых акцыянерных таварыстваў. Стэдынск кантралірує і атрымлівае прыбытак з капіталу ў 124.188 тысяч крон. У складу «камітэта» ўваходзіць таксама гандлёвы саветнік Лундвік, які з'яўляецца членам праўлення пяці гандлёва-прамысловых акцыянерных таварыстваў. Лундвік кантралірує і атрымлівае прыбыткі з капіталаў у 39.640 тыс. крон. Пяты член «фінляндскага камітэта»—капітан Пальме, які з'яўляецца членам праўлення чатырох страхавых таварыстваў з агульным капіталам у 6.300 тыс. крон. Такім чынам 5 гэтых «абаронцаў фінляндзкай дэмакратыі» кантралююць прадпрыемствы і банкі з агульным капіталам больш 400 млн. крон.

Вернымі збраеносцамі гэтай пяцёркі шведскіх капіталістаў з'яўляюцца лідэры шведскай сацыял-дэмакратычнай партыі і «правадыры» шведскіх профсаюзаў: Сандлер, Хеглунд, Стрэм, Ліндберг, Каспарсон, Тунберг і інш. Гэтыя суб'екты, трымаючыя ў сваіх руках апарат сацыял-дэмакратычнай партыі і рафармісцкіх профсаюзаў, прымушаюць залежачых ад іх матэрыяльна чыноўнікаў выконваць іх планы.

Сандлеры і хэглунды, заклікаючы шведскі народ афяраваць сваім жыццём за «дэмакратыю і свабоду», умоўчваюць, вядома, аб тым, што гутарка ідзе перш за ўсё аб выратаванні вельмі салідных капіталаў шведскіх капіталістаў і банкіраў, укладзеных у фінляндскую прамысловасць. Аднак шведскі народ усё больш і больш выкрывае здрадніцкую ролю шведскіх капіталістаў і іх падручных—агентаў англа-французскага ваеннага блока. Шведскія працоўныя адмаўляюцца ад дапамогі белафінам і выступаюць у абарону нейтралітэта Швецыі.

(ТАСС).

РУХ СУПРОЦЬ АКАЗАННЯ ДАПАМОГІ БЕЛА-ФІНЛЯНДЫІ

НЬЮ-ЙОРК, 25 лютага. (ТАСС). Як перадае газета «Дэйлі уоркер» з Атланты (штат Георгія), негрыцянская газета «Атланта уорлд» паведамляе, што негрыцянскае насельніцтва Новага Орлеана аказвае супраціўленне спробам гувераўскага камітэта дапамогі бела-Фінляндыі збіраць сродкі сярод негрыцянскіх школьнікаў. Газета «Атланта уорлд» рашуча выступае супроць збору сродкаў для манергеймаўскай Фінляндыі.

Як паведамляла гэтымі днямі газета «Дэйлі уоркер», школьныя чыноўнікі ў Лос-Анжэлосе аказваюць даўленне на дзяцей, каб яны ўносілі сродкі ў гувераўскі фонд дапамогі бела-Фінляндыі. Як указвае газета, кампанія гувераўскіх агентаў у рабочых раёнах Лос-Анжэлоса праваліўся.

СУПРОЦЬ ПАДПАЛЬШЧЫКАЎ ВАЙНЫ

ОСЛО, 26 лютага. (ТАСС). Нарвежская газета «Арбейдэрбладэт» паведамляе, што рабочыя-паперніки горада Люскарэ на агульнагарадскім сходзе прынялі рэзалюцыю, у якой патрабуюць захавання нейтралітэта Нарвегіі і асуджаюць правакацыйную дзейнасць падпальшчыкаў вайны. Члены спартыўнага рабочага клуба ў Эв'е, паведамляе газета «Арбейдэрэн», адмовіліся памагаць манергеймаўскай Фінляндыі.

У ПАГОНІ ЗА МІНІСТЭРСКІМІ ПАРТФЕЛЯМІ

Гэтымі днямі ў Манружы (пад Парыжам) сабралася першая пасля аб'яўлення вайны канферэнцыя кіраўнікоў мясцовых арганізацый «сацыялістычнай» партыі. Яе арганізатары абяцалі, што гэтая знаменальная канферэнцыя вырашыць «самыя актуальныя пытанні», пастаўленыя ваеннай абстаноўкай.

І вось у газеце «Папюлер» паявілася абшырная справаздача аб гэтай канферэнцыі. Аказваецца, сямай «злобадзённай» тэмай выступленняў на канферэнцыі было пытанне аб... «міністэрскім партфелі»—аб уваходжанні «сацыялістаў» ва ўрад. Спадручныя Блюма пералічалі свае «заслугі», білі сябе ў грудзі і патрабавалі міністэрскіх партфеляў ва ўрадзе Далад'е.

Адзін з удзельнікаў канферэнцыі — Брэйтман заявіў: «У 1914 годзе мы ўваходзілі ў састаў урада. Мы і цяпер павінны быць там. Спынім нашы рознагалоссі, патрэбуем нашай долі адказнасці».

Другі ўдзельнік канферэнцыі — Дормуа гаварыў: «У гэтыя трагічныя дні трэба вырашыць пытанне аб уваходжанні ва ўрад». Дормуа «катэгарычна настойваў» на тым, каб кіраўнікі «сацыялістычнай» партыі Леон Блюм і Поль Фор увайшлі ў састаў урада.

Пасля Дормуа зараз-жа выступіў Блюм. Блюм сказаў патэтычную прамову, у якой ён заявіў, што хоць «адказнасць ляжа» для яго плеч, але калі яму... аказваюць давер'е, то за ім справа не пастаіць...

Пара-другая ўдзельнікаў канферэнцыі прабавала было нясмела расказаць аб сапраўдных настроях насельніцтва. Прадстаўнік федэрацыі Сены і Уазы заявіў, што гэтая федэрацыя патрабуе, каб парламенцкая група «сацыялістычнай» партыі дабівалася ў ваенных умовах ажыццяўлення формулы «роўнасці афяр». Другі ўдзельнік канферэнцыі заклікаў «спробаваць палепшыць маральныя і матэрыяльныя ўмовы салдат, сялян і рабочых».

Але гэтыя нясмелыя галасы патанулі ў нястройным, але шумным хоры ахвочых на міністэрскія партфелі.

26 лютага. (ТАСС).

ТЭРОР У ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 25 лютага. (ТАСС). Агенцтва Гавас паведамляе аб тым, што трыбунал горада Провен (дэпартамент Сены і Марны) прыгаварыў да двухгадовага турэмнага зняволення рабочага Руданка, 42 год, пражываўшага ў горадзе Вільнеўв-Пці «за антыфранцузскія выказванні». За гэта-ж самае асуджан на чатыры гады турэмнага зняволення рабочы Міннар, пражываўшы ў г. Жуі-ле-Шаталь.

ПАМЯЦІ АКАДЭМІКА І. П. ПАЎЛАВА



27 лютага спаўняецца чацвертая гадавіна з дня смерці акадэміка Івана Петровіча Паўлава. Дзесяткі інстытутаў і лабараторый распрацоўваюць навуковую спадчыну найвялікшага рускага фізіёлага. Гадавіна з дня смерці І. П. Паўлава адзначаецца спецыяльнымі пасяджэннямі, дзе будуць падведзены вынікі работы над праблемамі вышэйшай нервовай дзейнасці, страваварэння, дзейнасці сардэчна-сасудзістай сістэмы і інш.

Выходзіць з друку першы том поўнага збору прац І. П. Паўлава. У гэтым томе—работы па фізіялогіі нервовай сістэмы і кровеабарота. Астатнія чатыры тамы падрыхтоўваюцца да друку.

(ТАСС).

ПІЛЬНАСЦЬ СОВЕЦКІХ ПАТРЫЁТАЎ

Раніцой 26 лютага абходчык 12 аддзялення 8 дыстанцыі пуці (Заходняя чыгунка) тав. Галята Івін, як заўсёды, абходзіў пуці свайго ўчастка. Вольгтнае вока абходчыка заўважыла лопнуўшую рэйку. Агаразіўшы небяспечнае месца, тав. Галята паведаміў аб гэтым брыгадзіру пуці, папярэдзіўшы такім чынам крушэнне пасажырскага поезда № 92.

Высокую свядомасць патрыёта радзімы праявіў і брыгадзір сельскагаспадарчай арцелі «Новы шлях», Полацкага раёна, т. Грэбнёў Аляксей. Ідучы па палатну чыгункі, ён заўважыў лопнуўшую рэйку. Аб гэтым тав. Грэбнёў неадкладна паведаміў на бліжэйшую станцыю Талачаўская, якая знаходзіцца ў 5 кілометрах. Рэйка была своечасова заменена.

Тт. Галята і Грэбнёву вынесены падзякі і выданы грашовыя ўзнагароды.

(БЕЛТА).

Адкрыўся дзіцячы санаторый

БАРАНАВІЧЫ. У жывапісным мясцовасці «Новая Ельня», Дзятлоўскага раёна, адкрыўся першы ў вобласці дзіцячы санаторый, разлічаны на 120 месц. Санаторый прыняў першую змену дзяцей.

Важнае „адкрыццё"

Газета «Советская Белоруссия» за 18 лютага і «Віцебскі рабочы» за 17 лютага паведамілі аб тым, што навуковымі работнікамі віцебскага абласнога архіва тт. Гузняевым і Юдзінай «знойдзены цікавыя дакументы», якія асвятляюць гісторыю стварэння помніка 1812 года ў Віцебску.

Падобныя знаходкі ярка характарызуе народная пагаворка—знайшоў тапор пад лавай. Справа ў тым, што ўсё знойдзенае цяпер апублікавана яшчэ без малога 30 год таму назад у выданнях: «Полоцко-витебская старина», 1911 г., Кніга І-я, стар. 147—159; «Полоцко-витебская старина», 1912 г., кніга II-я, стар. 349, 358, 365.

Мы не здзівімся, калі неўзабаве тт. Гузняеў і Юдзіна, вывучаючы архіўныя матэрыялы, пераканаюцца ў тым, што Віцебск адвеку стаіць на Заходняй Дзвіне, але нас вельмі здзіўляе некрытычны падыход некаторых газетных работнікаў да такіх адкрыццяў.

Ю. В.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЕСНАВОЙ ПАВОДК

Старшыня цэнтральнай камісіі ратацьбе з паводкай, начальнік Упр Рабоча-Сялянскай Міліцыі НКВД тав. Я. Ф. Гардзееў паведаміў тым, як ідзе падрыхтоўка да с паводкі.

— Улічваючы характар гэтай вятлікі снегапад, трэба чакаць веснавая паводка будзе больш звы На даных гідраметэаралагічнай над'ём вады будзе вельмі значным

На месцах ужо разгорнута падрыхтоўчая работа. Апрача цэ най камісіі створаны абласныя, га і раённыя тройкі. Да работы прыцягваюцца грамадзкія аргам актывісты. Умацоўваюцца масты бы, каб прапухліць затапленне рых прадпрыемстваў, электрас Прымаюцца меры да ліквідацыі мых лёдавых затораў на раках адкосікі ільну і ўзрыўных работ.

У Мінску ля гарадской электрас будуецца водаспрэнажная сі Мінску, Магілеве, Вілейцы і нек іншых гарадах падрыхтоўваюцца канні для перасялення жыхароў з якім пагражае затапленне. У ас для гэтай мэты будуць скарыстаць бы і іншыя грамадзкія будынкі. лёвым арганізацыям дана ўказанне часова завезці ў раёны, якім па паводка, прадукты харчавання, кара палкі. З наступленнем паводкі н мастох будуць устаноўлены круглас ныя дзяжурствы выратавальных пажарных, міліцэйскіх работнікаў.

МАСТАКІ-САМАВУЧК РЫХТУЮЦЦА ДА ДЭК

Самавучкі—мастакі, скульптары чыкі па дрэву, вышывальшчыцы лікі рыхтуюцца да выстаўкі вы мастацтва БССР, якая адкрыецца ў кве ў часе дожды беларускага мас Рад мастакоў-самавучак Мінска, і інш. гаралоў прадставілі ўжо сваіх будучых карцін, скульптур, тацкай вышыўкі. Тав. Лятаўскі ставіў эскіз карціны «Вызваленн ходняй Беларусі», тав. Стронгін—«П заны», тав. Зальцман—«Свята ў се» і т. д. Вышывальшчыцы пра над партрэтамі таварышоў Ле Сталіна, над мастацкай вышыўкай ніха».

Для дапамогі мастакам-самавуч падрыхтоўцы да дэкады пры рэспуб скім Доме народнай творчасці арган двухмесячны творчы семінар. Займ 50 лепшых мастакоў, скульптараў чыкаў па дрэву. Творчыя кансул будуць давать заслужаныя дзеячы тацтваў БССР, скульптары Азгур, і Бембель.

Водна-спартыўная база ў Аўгустове

Як паведамляе газета «Авангар горадзе Аўгустове, Беластоцкай об ствараецца водна-спартыўная база. гэтай мэты райвыканком выдзеліў гавані на рацэ Нета і возеры І Райвыканком перадаў таксама мясц спартыўнаму таварыству 200 пару маторных, грэбных лодак. У прадст лета моладзь Аўгустова будзе ме сваім распараджэнні багаты водна-ты ўны інвентар, што дасць магчы арганізаваць масавую здачу нормаў на чок ГПА.

642 тыс. рублёў выйгры

На тыражах дзяржаўных пазык ас касы Мінска выплацілі пазыкагрым кам на працягу мінулых двух мес гэтага года 642 тысячы рублёў выйг шаў.

Новыя тэлефонныя станц ў Гарадку і Мехаве

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону). У г. квартале ўступаюць у строй новыя фонныя станцыі ў раённых цэнтр Гарадку і Мехаве. Віцебская тэлефо сетка павялічваецца на 300 нумароў горадзе будуць дадаткова ўстаноў 10 тэлефонаў-аўтаматаў грамад карыстання. Заканчваецца рэканструк віцебскай міжгародняй тэлефоннай с цыі, якая абсталёўваецца ўдасканал апаратурай.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНО

Італа-германскае гандлёвае пагадненне

БЕРЛІН, 25 лютага. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Трансопзан, учора ў Рыме паспяхова закончыліся перагаворы аб урэгуляванні эканамічных адносін паміж Італіяй і Германіяй і аб тавараабмене паміж імі ў бягучым годзе. У апублікаваным у Рыме афіцыяльным камюніке ўказваецца, што «паміж прадстаўнікамі Італіі і Германіі дасягнут рад пагадненняў». Мусаліні, сказана ў камюніке, асабіста сачыў за ходам перагавораў.

Дасягнута таксама спецыяльнае пагадненне, рэгуліруючае пагранічны рух паміж абодвума краінамі.

ВАЙНА У ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ПАРЫЖ, 26 лютага. (ТАСС). Ва ўчарашнім вячэрнім афіцыяльным паведамленні гаворыцца: «Пасля мінамётнай падрыхтоўкі праціўнік прабагаў атакаваць адзін з нашых пастоў паміж Рэйнам і Вагезамі, але неадкладна быў адкінут з стратамі».

У сённяшнім ранішнім паведамленні сказана, што «на многіх участках фронта паміж Мозелем і Саарам наглядаецца ўзросшая актыўнасць перадавых часцей».

БЕРЛІН, 26 лютага. (ТАСС). У звопы вярхоўнага камандавання германскай армії адзначаецца, што ў раёне Эйпеля германская зенітная артылерыя збіла французскі самалёт.

БЕРЛІН, 26 лютага. (ТАСС). Як паведамляе інфармацыйнае бюро, учора на правым фланзе на ўсход ад Мозеля французскі атрад колькасцю каля 40 чалавек прабаваў узяць у палон пост германскага старажавога аховання. Спроба не ўдалася. У пагранічнай паласе адбіта вылазка другога французскага разведчага атрада.

Англійскі самалёт быў сустрэт германскімі знішчальнікамі над германскай бухтай і знішчан.

БІРМА ПАТРАБУЕ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

ЛОНДАН, 26 лютага. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, палата прадстаўнікоў законадаўчага сходу Бірмы (англійская калонія) аднадушна прыняла рэзалюцыю, у якой выражаецца жаль, што Англія ўцягнула Бірму ў вайну без згоды самога народа Бірмы. У рэзалюцыі ёсць патрабаванне аб тым, «каб прынцыпы дэмакратыі і забеспячэння праў нацыянальных меншасцей былі неадкладна прыменены да Бірмы, якая павінна быць прызнана незалежнай дзяржавай».

Забастоўка на авіяцыйным заводзе ў Англіі

ЛОНДАН, 25 лютага. (ТАСС). Як паведамляе газета «Дэйлі уоркер», на адным з авіяцыйных заводаў Цэнтральнай Англіі аб'яўлена забастоўка, якою ахвачаны амаль дзве тысячы чалавек. Рабочыя аб'явілі забастоўку ў знак пратэсту супроць нізкай заработнай платы, звышчасовых работ і немагчымых умоў працы.

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР
27 лютага
Абанемент № 117.
ПАДЗЬ СЯРЭБРАНАЯ
Пачатак у 7 г. 30 м. веч.
Каса адкрыта з 2 да 8 г. веч.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
27 лютага
Абанемент № 101.
МОЙ СЫН
Пачатак у 8 г. веч.

Кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
«БОЛЬШАЯ ЖИЗНЬ»
Кінатэатр «РОДИНА»
«МОРЯКИ»
Кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
АРСЕН
Кінатэатр «СПАРТАК»
«ГРОЗА»
Дзіцячы кінатэатр
«ЧЕТВЕРТЫЙ ПЕРИСКОП»
Кінатэатр «НАВІНЫ ДНЯ»
1. Камісары (кінаварыс).
2. З мінулага зямлі (навукова-тэхнічны фільм)

Да ўвагі праўленняў калгасаў і грамадзян
ВІЦЕБСКАЙ, ГОМЕЛЬСКАЙ, МІНСКАЙ, МАГІЛЕЎСКАЙ І ПАЛЕСКАЙ АБЛАСЦЕЙ
Па абавязковаму акладному страхаванню на 1940 г.
ЗАСТРАХАВАНА ЖЫВЁЛА
У КАЛГАСАХ — коні старэй 1 года, а племянныя старэй 6 месяцаў, буйная рагатая жывёла, свінні і авечкі старэй 6 месяцаў;
У КАЛГАСНІКАЎ — буйная рагатая жывёла ад 6 месяцаў;
У ІНШЫХ ГРАМАДЗЯН — коні старэй 1 года і буйная рагатая жывёла ад 6 месяцаў.
АБ ПАДЗЯЖЫ ЗАСТРАХАВАНАЙ ЖЫВЁЛЫ
У СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЦЯХ калгаснікі, рабочыя, служачыя, аднаасобнікі і іншыя грамадзяне
АБАВЯЗАНЫ ЗАЯВІЦЬ СЕЛЬСКАМУ СОВЕТУ,
а праўленні калгасаў — ПАДАЦЬ ПІСЬМОВЫЯ ЗАЯВЫ СЕЛЬСКАМУ СОВЕТУ і СТРАХАВОЙ ІНСПЕКЦЫІ.
У ГАРАДАХ заявы падаюцца ў гарадскую страхавую інспекцыю.
ЗАЯВЫ ПАВІННЫ ПАДАВАЦЦА НЕ ПАЗНЕЙ СУТАК З МОМАНТА ПАДЗЯЖУ ЖЫВЁЛЫ.
Праўленням калгасаў і іншым страхавацелям трэба памятаць, што ДЗЯРЖСТРАХ НЕ ВЫПЛАЧВАЕ СТРАХАВОЕ ВАЗМЯШЧЭННЕ ЗА ПАЎШУЮ ЖЫВЁЛУ КАЛІ ЎЛАСНІК ЯЕ НЕ ЗАЯВІЦЬ АБ ПАДЗЯЖЫ ВА ЎСТАНОЎЛЕНЫ ТЭРМІН.
УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖСТРАХА БССР.

ГАЛОЎАПТЭКАЎПРАЎЛЕННЕ НКаховы здароўя БССР
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА НАСЕЛЬНІЦТВА, ШТО
УСЕ АПТЭКІ, САНМАГІ, САНЛАРКІ І АПТЭЧНЫЯ ПУНКТЫ
ў гарадах і сельскіх мясцовасцях
ПРЫМАЮЦЬ АД НАСЕЛЬНІЦТВА
па ўстаноўленых цэнах наступныя
ЛЯКАРСТВЕНЫЯ РАСЛІНЫ І СУШАНЫЯ ЯГАДЫ:
ЧАРНІКУ, МАЛІНУ, ЛІКАПОДЗІЙ (дзераза), ВОСК (пчаліны), СПАРЫННЮ
ТРЫФОЛЬ—ліст, ТАЛАКНЯНКУ—ліст, БАДЗЯГУ, ВАЛЕРЫЯНАВЫ КОРАНЬ, БРУСНІЧНЫ ЛІСТ, РАКАВЫЯ ШЗЙКІ і інш.
ГРАМАДЗЯНЕ, помніце, што ўказаная ЛЕКСЫРАВІНА ІДЗЕ ДЛЯ ЛЯЧЭБНЫХ МЭТ.
ЗБІРАЙЦЕ і ЗДАВАЙЦЕ яе аптэчным прадпрыемствам.
Па ўсіх пытаннях загатоўкі лексыравіны звяртайцеся ў аддзяленні ГАПУ і Галоўаптэкаўпраўленне—Мінск, вул. Горкага, 1.
Галоўаптэкаўпраўленне НКАЗ БССР.

ДА ВЕДАМА ЎСІХ ГРАМАДЗЯН І ЎСТАНОЎ
На падставе пастановы СНК СССР ад 29 верасня 1939 г. № 1503
устаноўлен наступны парадак
узносу абанементнай платы і рэгістрацыі радыёпрыёмнікаў і радыёточак
абанементная плата павінна аплачвацца да 1 чысла ўперад;
ЗА РАДЫЁТОЧКУ — НЕ МЕНШ ЧЫМ ЗА АДЗІН МЕСЯЦ, А ЗА РАДЫЁПРЫЕМНІК — НЕ МЕНШ, ЧЫМ ЗА ТРЫ МЕСЯЦЫ.
ПРЫ НЯЎПЛАЦЕ ЎПЕРАД, А ТАКСАМА ЗА ПРАТЭРМІНОЎКУ ПЛАЦЯЖОЎ, НАЛІЧВАЕЦЦА ШТРАФ, НАПРЫКЛАД: калі абанент пратэрмінаваў чарговыя плацяжы за студзень і люты і вытварае ўплату гэтай запазычанасці ў сакавіку, з яго спаганяецца штраф за студзень — 3 руб., люты—2 руб і сакавік — 1 руб., а ўсяго ў агульнай складанасці 6 руб.
Пры запазычанасці за тры месяцы радыёточка выключаецца з сеці, а запазычанасць спаганяецца.
За самавольнае абстаўляванне радыёточкі і ўключэнне ў сець накладаецца штраф у памеры 50 руб
Грамадзяне і ўстановы, якія НАБЫЛІ РАДЫЁПРЫЁМНІКІ АБАВЯЗАНЫ ІХ ЗАРЭГІСТРАВАЦЬ з 3-дзённы тэрмін у паштовай канторы або на радыёвузле.
ПРЫЕМ ЗАЯЎ АБ ПАШКОДЖАННЯХ РАДЫЁТОЧАК ПРАВОДЗІЦЦА па Сталінскаму раёну — Совецкая, 33, тэл. 21-338; па Варашылаўскаму раёну — Совецкая, 168, тэл. 21-229 і па Кагановіцкаму раёну —Маскоўская, 12, тэл. 23-013.
АБАНЕМЕНТНАЯ ПЛАТА ПРЫМАЕЦЦА ЎСІМІ ПРЫХОДНЫМІ КАСАМІ БЕЛКОМУНБАНКА І КАСАЙ РАДЫЁВУЗЛА — Совецкая, 33.
Майстэрня пры радыёвузле вытварае РАМОНТ РОЗНАЙ РАДЫЁАПАРАТУРЫ.
МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАДЫЁСЕЦЬ.

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»
патрабуюцца
МАШЫНІСТКІ І АФІЦЫЯНТКА.
З прапановамі звяртацца ў сакратарыят рэдакцыі — Совецкая, 49, 3 паверх.

ДРУКАРНІ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»
патрабуюцца
ЧОРНАРАБОЧЫЯ І ПРЫБІРАЛЬНІЧЫЦЫ.
Звяртацца: Совецкая, 49, 3-гі паверх, пакой № 3.

МІНСКАЯ ГАЛАНТАРЭЙНАЯ ФАБРЫЦЫ ім. ФРУНЗЕ (Галантарэйная, 23)
патрабуюцца:
РАБОТНІЦЫ для работы ў цэхах.
ПУХАВЫЯ БУХГАЛТАРЫ, ЭЛЕКТРАТЭХНІК І НАДСОБНЫЯ РАБОЧЫЯ.
Звяртацца ў аддзел кадраў фабрыкі з 9 да 4 гадзін дня.

ШКЛОЗАВОДУ «ПРОЛЕТАРИЙ» (вул. Фабрычная, 10)
патрабуюцца:
некваліфікаваныя РАБОЧЫЯ І РАБОТНІЦЫ (не маладзей 18 год) для навучання на поўаўтаматах
ДЯЖУРНЫЯ СЛЕСАРЫ, ГРУЗЧЫКІ на аўтаматыны і ЧОРНАРАБОЧЫЯ
Звяртацца ў аддзел кадраў.

Уп. Галоўлітбела № Б—1657. Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., М., Ш.